СНЕГ — КРУГЛЫ ГОД 5

ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД ДЭПРЭСІІ? 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 СТУДЗЕНЯ 2019 г. СЕРАДА № 4 (28871)

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:**

*«Мы не памыліліся, адмовіўшыся ад адбору школьнікаў у пятыя класы гімназій па выніках экзаменаў. Хто сёння гаворыць, што трэба выбудаваць сістэму адбору больш матываваных, больш таленавітых дзяцей і для гэтага адзіны спосаб — экзамен, крывіць душой. Сёння любы добры педагог бачыць дзяцей, наколькі вучань праяўляе сябе, наколькі мае цягу да таго ці іншага прадмета. Атэстацыя — толькі нязначная частка, якая ў пэўнай ступені паказвае нейкі вынік. У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі варта стварыць сістэму роўных магчымасцяў для ўсіх дзяцей, навучэнцаў і ў малакамплектнай сельскай школе, і ў ліцэях і гімназіях Мінска».*

## КАРАТКА

**• ААТ «Беларуськалій» у 2018 годзе выпусціла рэкордны аб'ём угнаенняў — больш за 12 мільёнаў тон.**

• У Беларусі распрацавалі глюкометр з маўленчым суправаджэннем працэдуры вымярэння ўзроўню глюкозы ў крыві.

**• Брэсцкі аўтобусны парк з 9 студзеня адкрывае новы рэгулярны міжнародны маршрут Брэст — Беласток — Брэст.**

• Дзяржаўтаінспекцыя рэкамендуе кіроўцам загадзя праверыць тэхнічны стан машыны, асабліва гэта датычыцца ўладальнікаў дызельнага аўтатранспарту.

ISSN 1990 - 763X

# БОЛЬШ ЧЫМ ТРАДЫЦЫЯ

## Аляксандр Лукашэнка наведаў Раство храм-помнік у гонар Усіх Святых

Фота БелТА.

**У святочную калядную раніцу традыцыйна кіраўнік дзяржавы далучаецца да вернікаў, якія святкуюць Раство Хрыстова па юліянскім календары. Гэтым разам Прэзідэнт прыйшоў у храм-помнік у гонар Усіх Святых, чын Вялікага асвячэння якога адбыўся 14 кастрычніка 2018 года. Кіраўніка дзяржавы віталі Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, настаяцель прыхода Усіх Святых протаіерэй Фёдар Поўны, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка і сталічны мэр Анатоль Сівак.**

Прэзідэнт падкрэсліў, што свята Раства для нашага народа — больш чым хрысціянская традыцыя. Яно аб'ядноўвае людзей незалежна ад ступені духоўнасці і сілы веры. Закранае ў сэрцах глыбінныя пачуцці — жаданне любіць, дараваць, жыць у міры і згодзе.

СТАР. 2

# ПЕРАМАГЛІ 12-ы РАЗ

**XV Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі завяршыўся. А гэта значыць, што можна ўжо віншаваць пераможцаў: трэцяе месца заняла Фінляндыя, другое — Расія, першае — каманда кіраўніка нашай дзяржавы.**

Беларусы ў фінале адкрылі лік літаральна на першай хвіліне, забіўшы дзве шайбы з розніцай у 20 секундаў. Так каманда ўпэўнена пачала бой за першае месца. У выніку ўжо да першага перапынку лік складаў 3:0. У другім перыядзе беларусы працягнулі атаку і забілі яшчэ адзін гол. Пасля чаго расіяне перайшлі да больш актыўнай гульні і адправілі дзве шайбы запар у нашы вароты. Далей барацьба ішла на роўных, але беларусы паспелі яшчэ да канца другога перыяду закінуць расіянам дзве шайбы ў адказ. А на апошняй хвіліне гол забіў Аляксандр Лукашэнка. У трэцім перыядзе каманды таксама абмяняліся некалькімі шайбамі — у выніку каманда Прэзідэнта перамагла з лікам 8:5.

Дзмітрый Гогалеў, нападаючы каманды Расіі, так пракаменціраваў гульню: «Крыху пачатак матча праспалі і адразу атрымалі два галы. Потым вырулілі, але ўсё роўна цяжкавата. Беларусь вельмі моцная». Ён кажа, што прыязджае на турнір ужо трэці-чацвёрты раз і ўпершыню адзначае такі высокі ўзровень. «Па меншай меры, тое, што мы гулялі з фінамі, славакамі, швейцарцамі — усе тры гульні былі цяжкімі, то-бок не расслабляліся ні на секунду», — падкрэсліў нападаючы.

СТАР. 2

Фота БелТА.

Запрашальны білет

# Салісты La Skala і пляменнік Фрэнка Сінатры

## «Студзеньскія музычныя вечары» адкрываюць праграму мерапрыемстваў па святкаванні тысячагоддзя Брэста

**Першага студзеня 2019 года ўжо назвалі сімвалічным пачаткам тысячагоддзя Брэста. Бо 1019 год, які лічыцца годам заснавання старажытнага Берасця, даволі ўмоўная дата, не кажучы ўжо пра месяц і дзень. Таму ўяўляецца лагічным і зразумелым пачынаць святкаваць тысячагадовы юбілей горада ўжо зараз. Што і робіць прагрэсіўная музычная брэсцкая грамадскасць разам з усімі прыхільнікамі класічнай музыкі пачынаючы з 9 студзеня. Менавіта ў гэты дзень адкрываецца міжнародны фестываль «Студзеньскія музычныя вечары», XXXI па ліку.**

Фота Аляксандра ШУПЫГАЧА.

Прафесар Антоніа АМЕНДУНІ.

На гэты раз у Брэст прыедзе больш за 200 музыкантаў і выканаўцаў з дзесяці краін свету. І што цікава, большасць з іх стануць удзельнікамі «Вечароў» упершыню. Таму фэст атрымаўся вельмі новым — так яго сутнасць вызначыла нязменны **арганізатар, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, ганаровы грамадзянін Брэста Лілія БАТЫРАВА.** Але «новы» ў дадзеным кантэксце не азначае, што яго ўдзельнікі — малавядомыя пачаткоўцы. Многія з іх ужо лічацца сусветнымі знакамітасцямі. Напрыклад, скрыпачка Ганна Саўкіна выступала ледзь не з усімі знакавымі аркестрамі свету. Ды і іншыя музыканты заявілі аб сабе на самых лепшых сцэнах розных кантынентаў.

СТАР. 4

# БОЛЬШ ЧЫМ ТРАДЫЦЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Сама атмасфера гэтай урачыстасці настройвае на добрыя справы. Менавіта ў калядныя дні праводзіцца больш за ўсё дабрачынных, іншых падобных мерапрыемстваў. І я шчыра ўдзячны ўсім, хто праяўляе клопат пра людзей, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, нагадаўшы пра спрадвечную ісціну: ты сёння дапаможаш людзям, якія ў гэтым маюць патрэбу, а заўтра людзі дапамогуць табе».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Раство — адно з самых глыбокіх па сваім сэнсе хрысціянскіх свят. Яно сімвалізуе нараджэнне Чалавека, якому наканавана здзейсніць подзвіг, ахвяраваць сабой дзеля выратавання людзей.

Асаблівае значэнне гэтае свята мае для беларускай зямлі. Яна страціла мільёны сыноў і дачок, якія цаной сваіх жыццяў абаранялі Радзіму падчас войнаў.

«Лёсы многіх бясследна сцёр час. Але імёны герояў мінулага стагоддзя і нашых дзён мы ўвекавечылі, пабудаваўшы гэты велічны храм-помнік. Усё ў гэтым праекце, ад ідэі да ўвасаблення задумы, служыць галоўнай мэце — захаванню гістарычнай памяці, сцвярджэнню міру і згоды ў грамадстве», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Храм Усіх Святых стаў сапраўды народнай святыняй, бо значны ўнёсак у яго будаўніцтва зрабілі грамадзяне і дзяржава. І сёння велічны, прыгожы храм — свайго роду сімвал суверэннай Беларусі.

«Часы былі няпростыя, але мы ўзвялі гэты храм. Ён аднагодак нашай незалежнай, суверэннай Беларусі. Хай ён заўсёды сімвалізуе наш суверэнітэт. І ўсім, хто дрэнна глядзіць на нас, адназначна кажа пра тое, што пад бізуном мы больш ніколі хадзіць не будзем», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што беларусы цэняць мір: «Мы былі сведкамі гора і жахаў войнаў, як ніякі іншы народ у свеце. Беларусы гэта выпрабавалі спаўна. Мы цэнім мір і заклікаем усе народы да сяброўства і супрацоўніцтва. І ў гэтай місіі наша дзяржава, беларускі народ, наша царква заўсёды былі адзіныя». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларусы — горды, незалежны, талерантны і вельмі добры народ, які заўсёды добра ставіцца да ўсіх сваіх суседзяў.

Словы віншавання ад Прэзідэнта прагучалі для ўсіх прысутных: «Хай на нашай зямлі нараджаюцца дзеці. Нам вельмі важна, каб іх было шмат. Хай у іх будзе шчаслівае дзяцінства і доўгае цікавае, яркае жыццё — усё гэта залежыць толькі ад нас».

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі пажадаў Аляксандру Лукашэнку божай дапамогі ў яго адказным служэнні і падзякаваў за тое, што ён захаваў добрую традыцыю наведваць храм у час Раства і Вялікадня.

Адзначыў асаблівую атмасферу храма Усіх Святых і настаяцель прыхода Фёдар Поўны: «Тут для кожнага самі нябёсы разгарнулі благадаць».

Аляксандр Лукашэнка прыбыў на свята з падарункам — іконай «Раство Хрыстова». Абраз быў створаны майстрамі Свята-Елісавецінскага манастыра горада Мінска.

У адказ ад духавенства Прэзідэнт атрымаў Евангелле, выдадзенае і распрацаванае да асвячэння галоўнага прастола храма-помніка.

Да пачатку службы кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з роспісам царквы і агледзеў званы, якія ўздымуць на званіцу храма. Аляксандр Лукашэнка таксама ўсклаў кветкі да помніка Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Алексія II.

Сёння вернікі з усёй Беларусі наведваюць храм Усіх Святых і таму, што ў ім выстаўлены для пакланення крыж, які змяшчае рэшткі адзення Ісуса Хрыста і мошчы 21 святога. Рэліквія будзе знаходзіцца ў Мінску да 2 мая.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Да 100-годдзя МЗС

# «Жывыя» абрысы гісторыі

**У чым значнасць летапісу дыпламатычнай службы ў практычнай і надзённай справе дыпламатаў?**

**Гэту тэму абмеркавалі ўдзельнікі круглага стала, прысвечанага векавому юбілею галоўнага знешнепалітычнага ведамства краіны. На сустрэчы, якая прайшла пад эгідай часопіса «Беларуская думка» і дахам МЗС, прысутнічалі намеснік міністра замежных спраў Беларусі Андрэй Дапкюнас, супрацоўнікі міністэрства, ветэраны службы, навукоўцы і журналісты.**

«Сённяшняя наша тэма для разважання — гісторыя больш далёкая, дата стагоддзя. Сярод усіх юбілеяў яна, мусіць, найбольш уражвае — адзінка, два нулі. Міністэрства замежных спраў з вельмі трапяткім пачуццём ставіцца да гэтай даты. Ладзяцца мерапрыемствы, шмат што зроблена кіраўніцтвам — з ініцыятывы міністра ў плане ўвядзення і ўзаконьвання геральдыкі, службовых знакаў, форменнага адзення паслоў. Праводзяцца мерапрыемствы мемарыяльнага роду, звязаныя з людзьмі, якія працавалі тут. Гэта сродкі нагадаць, што гісторыя міністэрства пачалася не ў 1992 годзе, не ў 1944 годзе», — выказаў думку Андрэй Дапкюнас.

Па словах ветэранаў і навукоўцаў, вяліся дыскусіі, якую дату ўзяць як дзень заснавання дыпламатычнай службы Беларусі. Сярод варыянтаў нават быў дзень далучэння Беларусі да ААН, але ўсё ж такі вырашылі шукаць дату ў больш ранняй гісторыі краіны. І знайшлі... нататку аб заснаванні камісарыята па знешніх справах у газеце «Звязда» ад 22 студзеня 1919 года. Размяшчалася ведамства ў той час на вуліцы Койданаўскай, якая сёння вядомая як Рэвалюцыйная.

**❍ У тэму**

**Уважліва трэба ставіцца і да тэрміналогіі. Стагоддзе ў 2019-м будзе адзначаць менавіта дыпслужба Беларусі, а не беларуская дыпламатыя. Дыпламатыя — паняцце больш глыбокае, і мае на ўвазе ўдзел беларусаў у дыпламатычнай дзейнасці, а служба — гэта непасрэдна структура, ведамства.**

Удзельнікі ўспомнілі тых, хто сыграў вызначальную ролю ў станаўленні дыпламатычнай службы Беларусі: Кузьму Кісялёва, міністра замежных спраў БССР, яго пераемніка Анатоля Гурыновіча, нашага суайчынніка Андрэя Грамыку, які кіраваў знешнепалітычным ведамствам усяго Савецкага Саюза з 1957-га да 1985 года. У гэтым годзе, дарэчы, будзе 110-гадовы юбілей з дня нараджэння Андрэя Грамыкі.

— Для супрацоўнікаў міністэрства найбольш важна, каб калегі мае, каб я сам у сваёй працы быў не проста адміністратарам, чыноўнікам, а ў большай ступені дзейнічаў як грамадзянін. А грамадзянін не можа дзейнічаць, калі не ведае сваёй гісторыі, — акцэнтаваў увагу на значнасці гістарычнага фактару ў службе дыпламатаў Андрэй Дапкюнас.

Анансаваў намеснік міністра і ўрачысты сход да 100-годдзя МЗС, які мае быць самым прадстаўнічым. На ім збяруцца людзі, у той ці іншай сферы датычныя да ведамства.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ПЕРАМАГЛІ 12-ы РАЗ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Андрэй Міхалёў, нападаючы каманды Прэзідэнта Беларусі, звяртае ўвагу, што гэта не проста спартыўнае спаборніцтва: «Для нас, ветэранаў, гэта выдатнае свята, бо мы нячаста так збіраемся ўсе разам. Для нас гэта вельмі важна». Спартсмен кажа, што з некаторымі хакейнымі сябрамі разам сустракаецца і пасля гульняў.

Адначасова з Калядным турнірам падводзілі вынікі і па «Залатой шайбе». Трэцяе месца ў турніры заняла каманда «Атлант» (Кобрын), другое — «Сокал» (Горкі), першае — «Грыфоны» (Цэнтральны раён Мінска). Дарэчы, за каманду-пераможцу гуляе Мікалай Лукашэнка, які стаў найлепшым бамбардзірам на спаборніцтвах.

Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў гульцоў абодвух турніраў у асобных намінацыях, а таксама ўручыў кубкі за першыя месцы.

**Сюзанна Кольбенхаер, нападаючая зборнай Міжнароднай федэрацыі хакея:**

— Я была першым гульцом у жаночым хакеі ў Венгрыі і прывыкла гуляць з мужчынамі. Але ў такім турніры ўдзельнічаю ўпершыню. Для мяне гэта вялікі гонар. Да гэтага Мінск уразіў мяне падчас чэмпіянату свету ў 2014 годзе. Цяпер зіма, але ён мне па-ранейшаму падабаецца.

**Андрэй Нікалішын, гулец каманды Расіі:**

— У Беларусі традыцыйна праводзяць масавыя спартыўныя мерапрыемствы на самым высокім узроўні. Пераканаўся ў гэтым і на Калядным турніры, на які прыехаў не ўпершыню: быў у Мінску ў 2014 годзе на чэмпіянаце свету па хакеі. Кожны раз у вас усё арганізавана па найвышэйшым разрадзе. На Калядным турніры шмат каманд, гледачоў — усё святочна і вельмі душэўна.

**Саід аль-Нуаімі, нападаючы каманды ААЭ па хакеі:**

— Гэта вельмі паспяховы турнір для каманды Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Мне здаецца, што сёлета ў саперніка ў складах майстравітыя гульцы, якія раней выступалі ў вельмі моцных клубах. Таму для нас гэта выдатны вопыт. Беларусы дапамагаюць развіваць хакей у Эміратах. Яны дапамагаюць нам у тактыцы, у развіцці ўсіх кампанентаў гульні, таму вялікі дзякуй тым беларускім гульцам і трэнерам, якія працуюць у нас.

**Мацікайнен Пенці, галоўны трэнер каманды Фінляндыі:**

— Гульні часам былі складанымі. Наогул, тут вельмі высокі ўзровень — так і не скажаш, што турнір аматарскі. Усе гуляюць як профі і робяць усё магчымае, каб перамагчы і парадаваць мясцовых гледачоў.

**Джын Рафаэль Тую-Ландры, гулец каманды Кітая:**

— Я ўпершыню ў Мінску і ў захапленні ад гэтага горада. Людзі ў вас добразычлівыя і адкрытыя. Нягледзячы на тое, што мы не прайшлі ў фінал, гэта былі па-сапраўднаму гарачыя спаборніцтвы. Нашы саперні — прафесійныя хакеісты. Напрыклад, Зубрус — гэта мой кумір з дзяцінства, і я шмат чаму ў яго навучыўся.

**Надзея АНІСОВІЧ, Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кіеў вяртае томас аб аўтакефаліі ў Стамбул: у ім не хапае подпісаў

Томас аб аўтакефаліі праваслаўнай царквы Украіны на нейкі час вернецца ў Стамбул. У ім не хапае абавязковых подпісаў. Пра гэта заявіў кіраўнік дэпартамента па справах рэлігій і нацыянальнасцяў міністэрства культуры краіны Андрэй Юраш падчас каляднай літургіі з Сафійскага сабора ў Кіеве, паведамляе тэлеканал «112. Украіна».

«У найбліжэйшыя дні томас вернецца ў Стамбул у Канстанцінопальскі патрыярхат, бо зараз ён падпісаны толькі Усяленскім патрыярхам Варфаламеем. Там павінны быць подпісы ўсіх членаў Усяленскага Найсвяцейшага Сінода патрыярхата, — сказаў Юраш. — Літаральна праз два дні адбудзецца Сінод, дзе гэта будзе зроблена, і тады ўжо томас канчаткова і назаўсёды вернецца ва Украіну і будзе захоўвацца ў асаблівых умовах».

7 студзеня томас аб аўтакефаліі праваслаўнай царквы Украіны быў выстаўлены ў саборы кіеўскай Сафіі. Дакумент у сабор унеслі Пётр Парашэнка разам з мітрапалітам Епіфанам. 6 студзеня дакумент быў падпісаны ў Стамбуле.

## Каля 200 мільёнаў чалавек бяруць удзел у агульнанацыянальнай забастоўцы ў Індыі

Каля 200 мільёнаў чалавек у Індыі прымаюць удзел у агульнанацыянальнай двухдзённай забастоўцы, якая пачалася ў аўторак па закліку шэрагу агульнанацыянальных прафсаюзаў і левых рухаў.

Удзельнікі пратэсту вылучылі лозунгі з патрабаваннем павышэння мінімальнай аплаты працы і пенсій у розных галінах прамысловасці, паляпшэння сацыяльных умоў, новых рабочых месцаў для моладзі і шэраг іншых.

Забастоўшчыкі абвінавачваюць цэнтральны ўрад у нежаданні абараняць інтарэсы працоўных. Як адзначаюць індыйскія СМІ, забастоўка можа адбіцца на рабоце гарадскога, міжгародняга і чыгуначнага транспарту, банкаўскага сектара, страхавых кампаній, тэлекамунікацый. У некаторых раёнах закрываюцца школы і іншыя навучальныя ўстановы. У гарадах закрыты многія крамы і офісы.

## Кіраўнік МУС Францыі паабяцаў адказаць жорсткімі мерамі на агрэсію маніфестантаў

Міністр унутраных спраў Францыі Крыстоф Кастанер асудзіў заклікі да гвалту ў адносінах да вартавых правапарадку, якія пачасціліся сярод маніфестантаў, і анансаваў узмацненне жорсткасці мер у дачыненні да агрэсіўна настроеных удзельнікаў руху «жоўтых камізэлек».

«Заклікі да гвалту становяцца паўсядзённай з'явай, але, што горш, яны з'яўляюцца прадметам гонару [для тых, хто іх робіць]», — сказаў міністр, чые словы транслявaў тэлеканал BFM. «Ультрагвалту мы супрацьпаставім ультражорсткасць», — падкрэсліў ён.

Рух «жоўтых камізэлек» паўстаў у Францыі ў сярэдзіне лістапада ў знак пратэсту супраць росту цэн і падаткаў. У далейшым маніфестанты выступалі супраць інстытутаў улады, якія яны абвінавачваюць у неэфектыўным кіраванні краінай і ў тым, што прынятых мер па барацьбе з беднасцю недастаткова. У краіне прайшлі ўжо восем агульнанацыянальных дзён пратэсту, якія ў многіх буйных гарадах, у тым ліку ў Парыжы, суправаджаліся жорсткімі сутычкамі маніфестантаў з паліцыяй, падпаламі аўтамабіляў, біццём вокнаў, рабаваннем магазінаў.

# Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 1

*3 студзеня 2019 г.* *г. Мінск*

## Аб прысуджэнні прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. За актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае захаванню і памнажэнню нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцяў і ідэй міласэрнасці, прысудзіць прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» 2018 года:

аўтарскаму калектыву ў складзе БЫКАВАЙ Юліі Віктараўны, аўтара музыкі і тэкстаў песень, АЛЕЙНІКА Яўгена Фёдаравіча, аўтара музыкі і тэкстаў песень, — за ўвасабленне тэмы малой радзімы ў сучасным эстрадным мастацтве, стварэнне цыкла высокамастацкіх вакальных твораў патрыятычнага напрамку;

калектыву Біблейскай камісіі Беларускай праваслаўнай царквы і калектыву Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў касцёла камісіі Божага культу і дысцыпліны сакрамантаў пры Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі — за ажыццяўленне перакладаў з арыгінальных моў і выданне кніг Новага Запавету на беларускай мове, што спрыяе ўзбагачэнню духоўнай спадчыны;

калектыву грамадскай дабрачыннай арганізацыі «Беларускі дзіцячы хоспіс» — за актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, сцвярджэнне ідэй чалавекалюбства і міласэрнасці, значны ўклад у стварэнне нацыянальнай сістэмы дзіцячай паліятыўнай медыцынскай дапамогі, будаўніцтва на дабрачыннай аснове і арганізацыю работы дзіцячага хоспіса ў пасёлку Вопытны Мінскага раёна;

калектыву дзяржаўнай установы сацыяльнага абслугоўвання «Веснаўскі дом-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця» — за вялікі ўклад у зацвярджэнне маральных традыцый, ідэй чалавекалюбства і міласэрнасці, рэалізацыю мерапрыемстваў, накіраваных на сацыялізацыю асоб з абмежаванымі магчымасцямі.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» 2018 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызначыць, што грашовая частка адной прэміі дзеліцца ў роўных долях паміж калектывамі аўтараў, пазначаных у абзацы трэцім пункта 1 гэтага Указа.

4. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з гэтым Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

5. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА.**

# Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 2

*3 студзеня 2019 г.* *г. Мінск*

## Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. За выдатныя дасягненні ў галіне тэатральнага, музычнага, эстраднага мастацтва, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2018 года:

калектыву дзяржаўнай установы «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь» — за выдатныя дасягненні ў галіне музычнага мастацтва, рэалізацыю ў 2017—2018 гадах патрыятычнага творчага праекта «Айчыне служым»;

калектыву дзяржаўнай установы «Пастаўскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва» — за значны ўклад у развіццё аматарскай мастацкай творчасці пажылых людзей і людзей з абмежаванымі магчымасцямі, актыўную гуманітарную і дабрачынную дзейнасць, захаванне рэгіянальных духоўных і культурных традыцый;

калектыву ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная харэаграфічная гімназія-каледж» — за выдатныя дасягненні ў навучанні і выхаванні творчай моладзі, значны ўклад у развіццё нацыянальнай школы класічнага танца і правядзенне дабрачынных праектаў «Творчасць юных — роднай Беларусі», «Дзеці дзецям», «І памятае свет выратаваны»;

МАНАЕВУ Віктару Сяргеевічу, вядучаму майстру сцэны дзяржаўнай установы «Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы», народнаму артысту Беларусі, — за высокае прафесійнае майстэрства, значныя дасягненні ў галіне тэатральнага мастацтва, стварэнне ў тэатральным сезоне 2017/2018 года вострахарактарных вобразаў у спектаклях «Рэвізор» і «Школа падаткаплацельшчыкаў»;

калектыву народнага сямейнага ансамбля «Сваякі» філіяла «Дом культуры аграгарадка Юбілейны» дзяржаўнай установы культуры «Ваўкавыскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці» — за захаванне, развіццё і папулярызацыю беларускіх традыцый сямейнай аматарскай творчасці, арганізацыю і правядзенне фестывалю-конкурсу творчых сямейных дынастый «Сваякі запрашаюць»;

аўтарскаму калектыву Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў складзе КАМАДЗЕЯ Сяргея Юр'евіча, начальніка ўпраўлення па распрацоўцы і рэалізацыі спецыяльных праектаў галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай рабоце апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, ГОЛУБЕВАЙ Алены Уладзіміраўны, намесніка начальніка ўпраўлення па распрацоўцы і рэалізацыі спецыяльных праектаў галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай рабоце апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, КАНДРАТОВІЧ Наталлі Леанідаўны, старшыні Ганцавіцкага раённага аб'яднання арганізацый прафсаюзаў, — за выдатныя дасягненні ў галіне эстраднага мастацтва і правядзенне ў 2018 годзе цыкла канцэртаў рэспубліканскай народна-патрыятычнай акцыі «Мы — разам!», прымеркаваных да Года малой радзімы;

творчаму калектыву былых малалетніх вязняў фашызму «Лёсы» — за значныя дасягненні ў справе захавання памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, патрыятычнае выхаванне моладзі, годнае прадстаўленне Рэспублікі Беларусь у ходзе правядзення акцыі «Не — фашызму! Дзяцінства без вайны!»;

народнаму інструментальнаму ансамблю «Нясвіжскія лыжкары» дзяржаўнай установы культуры «Нясвіжскі раённы цэнтр культуры» — за значны ўклад у папулярызацыю музычнага мастацтва, мэтанакіраваную работу па эстэтычным выхаванні падрастаючага пакалення, актыўную канцэртную дзейнасць;

ВАСІЛЕВІЧ Марыі Віктараўне, магістранту Інстытута магістарскай падрыхтоўкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт», уладальніцы тытулаў «Міс Беларусь — 2018» і «Міс свету Еўропа», — за значны ўклад у развіццё міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, актыўную дабрачынную дзейнасць.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2018 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з гэтым Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА.**

# Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 3

*3 студзеня 2019 г.* *г. Мінск*

## Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

У мэтах стымулявання і сацыяльнай падтрымкі дзейнасці ў галіне фізічнай культуры і спорту п а с т а н а ў л я ю:

1. За актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць гарманічнаму фарміраванню асобы, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» 2018 года ў памеры 100 базавых велічынь кожнаму:

БАРАНОЎСКАЙ Ірыне Робертаўне, старшаму трэнеру-выкладчыку па спорце аддзялення скачкоў на батуце вучэбна-спартыўнай установы «Гродзенская спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву № 3»;

ГЕРСТЭНУ Барысу Ізідоравічу, намесніку загадчыка аддзела спартыўнага вяшчання закрытага акцыянернага таварыства «Другі нацыянальны тэлеканал»;

МАЗУРОНАК Вользе Сяргееўне, спартсмену-інструктару нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы Міністэрства спорту і турызму.

2. Міністэрству фінансаў выдзеліць з рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Міністэрству спорту і турызму неабходныя сродкі на выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» 2018 года.

3. Не абкладаць падаходным падаткам з фізічных асоб сумы спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» 2018 года, якія выплачваюцца ў адпаведнасці з гэтым Указам.

4. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА.**

На слыху

# ЗРОБЛЕНА З ДУШОЙ

**Адным з чатырох уладальнікаў прэміі «За духоўнае адраджэнне» сёлета стаў сямейны і творчы дуэт Яўгена АЛЕЙНІКА і Юліі БЫКАВАЙ — аўтараў музыкі і тэкстаў песень, што ўвайшлі ў вялікі творчы праект, прысвечаны тэме малой радзімы.**

Афіцыйнае абгрунтаванне высокай дзяржаўнай узнагароды гучыць так: «за ўвасабленне тэмы малой радзімы ў сучасным эстрадным мастацтве, стварэнне цыкла высокамастацкіх вакальных твораў патрыятычнага кірунку». Калі ж гаварыць простымі словамі, то кампазітар і паэтка здолелі спалучыць тонкую лірыку — душэўнасць і трапяткую цеплыню, што суправаджаюць успаміны кожнага чалавека пра дзяцінства, бацькоў, родны дом, незалежна ад таго, маленькая гэта вёска ці вялікі горад, і разам з тым правільны выхаваўчы пасыл, калі хочаце, грамадзянскі пафас. А песні, якія ў выніку атрымаліся, не проста сучасныя і запатрабаваныя — яны здольныя ўпрыгожыць канцэрт любога ўзроўню, ад школьнага вечара да маштабнага дзяржаўнага свята.

Нагадаем, у творчым багажы Яўгена Алейніка ўжо медаль Францыска Скарыны, атрыманы ў пачатку 2017-га як прызнанне многіх заслуг — у іх спісе можна згадаць дзіцячы і дарослы конкурс «Еўрабачанне», нацыянальную музычную прэмію «Ліра», у распрацоўцы канцэпцыі якой удзельнічаў кампазітар і прадзюсар, і загалоўную музычную тэму чэмпіянату свету па хакеі — 2014... Ды што паглыбляцца ў мінулае: толькі летась песня «Bright year, bright you» на музыку Яўгена Алейніка (словы Святланы Гераськовай) заняла другое месца ў конкурсе песень для цырымоніі адкрыцця і закрыцця II Еўрапейскіх гульняў, а пад канец 2018 года Яўген і Юлія прэзентавалі новы альбом «Куточак Беларусі», удзел у якім узялі як маладыя беларускія артысты, так і вядомыя дзеячы эстрады — Іна Афанасьева, Анатоль Ярмоленка, Алена Ланская, Іскуі Абалян, Аляксандр Саладуха.

Словам, цяперашняя ўзнагарода стала, з аднаго боку, лагічна прадказальнай, а з другога — усё ж прыемна нечаканай. «Звязда» павіншавала дуэт з прызнаннем заслуг і спытала пра ўражанні.

— Такія рэчы заўжды адбываюцца прыемна і нечакана — калі ты заўзята працуеш, творчы працэс распісаны літаральна па днях, і, здаецца, няма месца для сюрпрызу. А потым у адзін цудоўны момант раздаюцца дзясяткі тэлефанаванняў, сябры і журналісты віншуюць з прэміяй, — адказалі лаўрэаты. — Насамрэч усе атрыманыя ўзнагароды — і падзяка Прэзідэнта за перамогу Лёшы Жыгалковіча ў дзіцячым «Еўрабачанні-2007», і медаль Францыска Скарыны, і прэмія «За духоўнае адраджэнне», — як мы лічым, атрыманыя намі ўдваіх. І вельмі радасна, што нас перастаюць штучна раздзяляць і дапытвацца, хто галоўны ў дуэце Алейнік—Быкава, дзе чыя заслуга, а пачынаюць разумець, што творчасць у нас заўжды адбываецца на роўных... Ці будзем мы спыняцца? Не, не будзем. У планах ужо ёсць выпуск альбома пад рабочай назвай «Куточак Беларусі 2.0» — насамрэч, безумоўна, назва будзе іншая, але сутнасць у тым, каб сабраць у адно цэлае песні іншых аўтараў і выканаўцаў, аб'яднаныя тэмай малой радзімы, цеплыні чалавечых стасункаў, наогул вечных каштоўнасцяў. Таксама ў канцы красавіка плануем вялікі аўтарскі канцэрт паводле альбома «Куточак Беларусі», цяпер якраз шукаем, на якой пляцоўцы будзе зладжаны гэты канцэрт. І, натуральна, працуем над новымі песнямі — частка з іх ужо напісана, а некаторыя існуюць толькі ў адным-двух словах, але ўжо зразумела, што песня з'явіцца.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Кругагляд

# Мінск — у топе!

## Брытанская газета заклікае наведаць беларускую сталіцу ў 2019 годзе

**«Гэта год, каб трапіць у Мінск, Ратэрдам і Венецыю» — так пачынаецца артыкул вядомага выдання Independent аб найлепшых еўрапейскіх гарадах для падарожжаў у новым годзе.**

Менавіта з Мінска і пачынаецца рэйтынг. Чаму ж варта адправіцца ў гэты горад? Аўтар артыкула Эстэла Шардлоў нагадала, што сёлета беларуская сталіца прыме другія Еўрапейскія гульні. Аднак журналістка адзначыла, што гэта ўсяго толькі яшчэ адна прычына, па якой можна здзейсніць чарговую паездку, разам з новым 30-дзённым бязвізавым рэжымам і адноўленым Старым горадам, у якім можна знайсці мноства кавярняў і кактэйль-бараў. У матэрыяле звяртаюць увагу на чысціню і бяспеку Мінска, а таксама прыязнасць яго жыхароў. Пры гэтым патэнцыйных турыстаў папярэджваюць: не варта чакаць, што ўсе ў беларускай сталіцы будуць размаўляць на англійскай мове. «Гэтым летам мадэрнізаваны стадыён «Дынама» стане цэнтрам спартыўных спаборніцтваў, у той час як астатняя частка горада раскрываецца ў доўгіх праспектах, неакласічных палацах і велічных плошчах», — рэзюмуе журналістка.

Куды яшчэ вядомае выданне рэкамендуе з'ездзіць у 2019-ы? У Ратэрдам (Нідэрланды), Сітжэс (Іспанія), Арль (Францыя), Сараева (Боснія), Рым (Італія), парыжскі Дыснэйлэнд, Бялград (Сербія), Венецыя (Італія) і Брысталь (Вялікабрытанія).

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

Нашы дзеці

# Хай беражэ вас ад бяды святло калядnай зоркі

**Юбілейная 25-я «Калядная ёлка — нашы дзеці» заззяла ўчора ў Свята-Духавым кафедральным саборы для 300 дзетак з Гомельскай вобласці. Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел правёў Калядную літургію і блаславіў усіх прысутных.**

Фота Андрэя САЗОНАВА.

Хлопчыкі і дзяўчынкі, запрошаныя на свята, парадавалі Уладыку песнямі, вершамі ды самаробнымі сувенірамі. Вядома, не абышлося і без каляднага пірага з 25 свечкамі, агульных фотаздымкаў і шчырых слоў.

Ансамбль «Церніца», які ў самыя цяжкія гады даў каля тысячы канцэртаў на землях, што пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі, выканаў песню «Святы вечар на зямлі». Менавіта гэты калектыў 25 гадоў таму адкрываў і самую першую калядную ёлку, арганізаваную БРСМ і царквой. «Хай анёлы Гасподні ахаваюць ад нягод, хай шчаслівым і удалым будзе гэты новы год», пажадалі артысты ўсім прысутным.

Свае творчыя пажаданні-віншаванні прывезлі і юныя артысты з ансамбля «Міlавіца» Буда-Кашалёўскага раёна, ансамбля «Верасок» з Хойнік. Далучыліся да свята і дзеці з Мазыра, Івянца, Лельчыц, Калінкавіч, выхаванцы ліцэя Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

А госці з пасёлка Вішнёўка, які стаў новай радзімай перасяленцам з розных раёнаў краіны, запрасілі да сябе, каб паказаць, як вырас парк, дрэвы ў якім 15 гадоў таму саджалі прадстаўнікі з усіх пацярпелых ад аварыі раёнаў.

— Штораз я асабліва перажываю сустрэчу з дзецьмі з чарнобыльскай тэрыторыі. Сёння, калі бачу іх твары і чую іх галасы, мне здаецца, што там, на той зямлі, асаблівая атмасфера, — заўважыў Уладыка Павел. — Гэта характар нашага народа, ён непераможны і незразумелы для многіх заходніх людзей. Чалавек, які не верыць у Бога, даўно б пакінуў гэту зямлю. А нашы людзі там жывуць, працуюць і працвітаюць. Звярніце ўвагу, якая сіла духу ў гэтых людзей. Наш народ непераможны, калі ён такую бяду змог перажыць, — усе разам, з Божай дапамогай.

Мітрапаліт Павел пажадаў гасцям храма навучыцца за ўсё дзякаваць Богу, а не звяртацца да яго толькі тады, калі нешта здарылася.

**Ірына СІДАРОК.**

Эканоміка адукацыі

# КОЛЬКІ КАШТУЕ ПАДРЫХТОЎКА ШКОЛЬНІКА?

**Пастановай Савета Міністраў ад 29 снежня 2018 года № 975 зацверджана Палажэнне аб планаванні выдаткаў мясцовых бюджэтаў на фінансаванне дзяржаўных устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, падпарадкаваных структурным падраздзяленням мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.**

Нарматыў выдаткаў на навучанне і выхаванне аднаго чалавека ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, размешчаных у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, складае 1667,92 рубля ў год, у сельскіх населеных пунктах — 3808,76 рубля ў год.

Нарматыў уключае бягучыя выдаткі устаноў, што накіроўваюцца на забеспячэнне рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, спецыяльнай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), дашкольнай адукацыі, праграм выхавання. У тым ліку гэта выдаткі на аплату працы педагагічных і іншых работнікаў, штомесячныя кампенсацыі выдаткаў на набыццё вучэбнай і метадычнай літаратуры педагагічнымі работнікамі, выхадныя дапамогі, камандзіроўкі, набыццё прадметаў забеспячэння і расходных матэрыялаў, аплату паслуг сувязі, транспартных паслуг, рамонт абсталявання і інвентару, іншыя бягучыя выдаткі.

Прадугледжана таксама прымяненне карэктуючых каэфіцыентаў да ўстаноўленых нарматываў у залежнасці ад тыпу ўстановы адукацыі, колькасці навучэнцаў у ёй і тэрыторыі яе размяшчэння.

Міністэрству адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам фінансаў даручана штогод уносіць ва ўрад прапановы па пераглядзе названага нарматыву.

Як паведамляецца на сайце ўрада, пастанова прынята ў адпаведнасці з Бюджэтным кодэксам Рэспублікі Беларусь і ў мэтах удасканалення бюджэтнага фінансавання ў галіне адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ...І пляменнік Фрэнка Сінатры

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Адкрыецца фестываль гала-канцэртам салістаў італьянскага опернага тэатра La Skala Джані Манджардзіна і Альда Капута. Запрасіць іх у Брэст дапамог даўні сябар фэсту «Студзеньскія музычныя вечары», улюбёнец брэсцкай публікі, чароўная флейта міланскай оперы — Антоніа Амендуні. Сам флейтыст выступаў на «Вечарах» сем разоў, гэтым разам ён не едзе на фестываль, але парэкамендаваў таленавітых салістаў, — падзялілася сакрэтамі фестывальнай кухні Лілія Батырава. І паведаміла, што ў першы вечар на сцэну Брэсцкага тэатра драмы таксама выйдуць салісты опернай праграмы Вялікага тэатра Расіі Тамуна Гочашвілі, Вікторыя Каркачава, Алуда Тодуа. Оперныя зоркі будуць спяваць у суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам Аляксандра Сасноўскага.

Яшчэ адной цікавінкай сёлетняга фестывалю стане прыезд Тома Сінатры, пляменніка легендарнага амерыканскага спевака, акцёра, кінарэжысёра і шоўмена Фрэнка Сінатры. Том — ураджэнец Сіцыліі, па папулярнасці не саступае знакамітаму дзядзьку, уваходзіць у пяцёрку найлепшых гітарыстаў свету.

— Некалі я планавала запрасіць на наш фэст Фрэнка Сінатру, — расказвае Лілія Батырава. — Але не атрымалася. Не паспела. І вось нечаканасць: са мной звязалася па тэлефоне менеджар Тома, ураджэнка Беларусі, якая ведае наш фестываль. Тады я сказала, што, калі б нават ён не іграў і не спяваў, з-за аднаго імені я запрасіла б яго ў Брэст хаця б у якасці гледача. А нам прапанавалі віртуознага музыканта, які выконвае хіты Фрэнка Сінатры. Гэта для нас, безумоўна, знаходка.

І такіх знаходак ды адкрыццяў Лілія Рыгораўна абяцае шмат на сёлетніх «Вечарах». Чаго варты лірычнае сапрана Яанны Наўрот з Польшчы і бас-саліста Марыінскага тэатра Вадзіма Краўца!

Том Сінатра будзе выступаць у другім аддзяленні другога вечара 10 студзеня. А першае аддзяленне адкрые вядомы расійскі піяніст, дацэнт Маскоўскай кансерваторыі Міхаіл Лідскі. На трэцім музычным вечары выступяць піяніст-віртуоз, выпускнік парыжскай кансерваторыі Джонатан Бенішу з Манака, а таксама вядомы кларнетыст, выкладчык Акадэміі музыкі ў Гданьску Анджэй Вайцэхоўскі, выпускнік Музычнай акадэміі пры тэатры La Skala Чжан Цзын Вэй з Кітая.

Арганізатары падкрэслілі, што кошт білетаў на «Вечары» не мяняецца ўжо тры гады, але для тых, каму і гэтая цана ўяўляецца значнай, прадугледжаны бясплатныя альбо зусім бюджэтныя канцэрты. Адзін з іх пройдзе 10 студзеня ў музычным каледжы. А ў царкве па вуліцы Машэнскага выступіць сімфанічна-духавы аркестр Харальда Хепнера з горада-пабраціма Брэста Равенсбурга. Выступіць бясплатна для публікі дзякуючы спонсару — брэсцкаму прадпрыемству «Компа».

А вось з маладымі брэсцкімі музыкантамі і спевакамі будуць сустракацца ўдзельнікі кіеўскага маладзёжнага камернага хору «Сафія». У іх вельмі насычаны графік на гэтыя калядныя дні, але маладыя, лёгкія на пад'ём спевакі згадзіліся прыехаць менш чым на суткі. Яны выступаюць і з'язджаюць у той жа дзень. І ўпрыгожаць сабой апошні вечар фэсту, перакананая яго арганізатар.

На прэс-канферэнцыі з нагоды адкрыцця «Студзеньскіх музычных вечароў» **начальнік упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Сяргей ПАНАСЮК** падкрэсліў, што фестываль стане яркім пачаткам святкавання тысячагадовага юбілею Брэста.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Надвор'е

# Падмарозіць нас крыху...

**На працягу тыдня ўмовы надвор'я ў асноўным будзе вызначаць вобласць паніжанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў халоднай паветранай масе, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень на тэрыторыі краіны месцамі чакаюцца кароткачасовы снег, слабая мяцеліца. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе 7—13 градусаў марозу, па крайнім захадзе будзе 4—6 градусаў ніжэй за нуль. Невялікі кароткачасовы снег месцамі пройдзе і ў чацвер. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 8 да мінус 13 градусаў, пры праясненнях -16 марозу. Днём будзе 5—11 градусаў ніжэй за нуль.

У пятніцу наша краіна атрымае чарговую порцыю холаду з поўначы кантынента. Удзень франтальны раздзел, які ссоўваецца з Балтыйскага мора, абумовіць па паўночным захадзе краіны снег, слабую завіруху. На асобных участках дарог будзе галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 10—15 градусаў, пры праясненнях панізіцца да мінус 17 градусаў. Удзень будзе 4—11 марозу.

**А між тым...**

## Калядныя маразы будуць дакладна

Пра гэта заявіў **начальнік службы метэаралагічных прагнозаў рэспубліканскага Гідраметэацэнтра Аляксандр БЯГАНСКІ.** Ён праінфармаваў, што студзень спецыялісты чакаюць з некалькі паніжаным тэмпературным фонам. «Калі норма па тэрыторыі краіны складае ад 3 да 6 градусаў марозу, то сёлета мы прагназуем сярэднямесячную тэмпературу на 1 градус ніжэй нормы, месцамі па Беларусі тэмпература будзе каля яе», — расказаў начальнік службы.

Калі ацэньваць пачатак года, то цёплымі для яго былі першыя дні месяца, у сярэдзіне першай дэкады адбылося пахаладанне, зараз тэмпературны фон у сярэднім значна ніжэй нормы. Некаторае пацяпленне прагназуецца ў пачатку другой дэкады — на маючых адбыцца выхадных і ў пачатку наступнага тыдня. «Так званыя калядныя маразы ў гэтым годзе мы таксама прагназуем: больш ва ўсходняй частцы краіны, але ў цэлым паніжэнне тэмпературы адбудзецца на ўсёй тэрыторыі краіны», — удакладніў Аляксандр Бяганскі. У канцы студзеня таксама будзе досыць марозна.

Другі месяц зімы чакаецца рэкордным не толькі на маразы. Як прагназуецца, у студзені нас як мае быць засыпле снегам. Ва ўсякім выпадку, ападкаў будзе значна больш за кліматычную норму.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Беражыце сябе!

# Небяспечная забава

**У Магілёве пры катанні з горкі на цюбінгу насмерць разбіўся малады чалавек.**

Як паведаміла **афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Юлія ГАНЧАРОВА,** трагедыя адбылася позна ўвечары. 24-гадовы хлопец, калі з'язджаў з гары ў парку Падміколле, падскочыў на трампліне і з лёту ўдарыўся галавой аб ліхтарны слуп. «Прызямленне» аказалася фатальным. Маладога чалавека выратаваць не ўдалося.

Па словах Юліі Ганчаровай, за 6 і 7 студзеня траўмы на горках атрымалі пяцёра дзяцей. Так, у Мінску, у Фрунзенскім раёне, 6-гадовы хлопчык пры спуску на цюбінгу з гары стукнуўся галавой аб дрэва і атрымаў шматлікія пераломы і траўмы.

У вёсцы Лескаўка (Мінскі раён) 8-гадовая дзяўчынка, катаючыся на цюбінгу, стукнулася галавой аб дрэва — шматлікія пераломы і траўмы. У Мінску, у Цэнтральным раёна, 9-гадовая дзяўчынка пры спуску на цюбінгу з гары, сутыкнулася галавой з іншым дзіцем. Як вынік — цяжкія траўмы. У Ваўкавыску 11-гадовы хлопчык, з'язджаючы на цюбінгу, стукнуўся спіной аб камяні — цяжкія траўмы, разрывы ўнутраных органаў.

Цюбінг — гэта катанне на надзіманых санках, ватрушках, пончыках, абаранках. Яно з'яўляецца папулярным правядзеннем вольнага часу зімой. Але трэба быць уважлівым пры абыходжанні з гэтай спартыўнай прыладай і не забываць — у першую чаргу — пра бяспеку дзяцей. Рухацца з гары за кошт асаблівасцяў канструкцыі цюбінг можа вельмі хутка, і даць рады з ім на вялікай хуткасці ў малых не заўсёды атрымліваецца.

**<u>У сувязі з гэтым хочацца звярнуцца да бацькоў і нагадаць простыя правілы, якія дазволяць захаваць здароўе іх дзецям і ім самім</u>.**

- **Пазбягайце актыўнага адпачынку паблізу аўтамабільных дарог, чыгуначных шляхоў, замёрзлых вадаёмаў, а таксама іншых месцаў, якія з'яўляюцца зонай павышанай небяспекі.**
- **Не выкарыстоўвайце для катання схілы і спускі, на маршрутах якіх прысутнічаюць староннія аб'екты (дрэвы, сцены будынкаў, слупы і інш.).**
- **Выкарыстоўвайце ахоўныя сродкі (налакотнікі, накаленнікі, шлемы).**
- **Звяртайце ўвагу на ўзроставыя абмежаванні, названыя ў інструкцыях да спартінвентару.**
- **Не адпускайце маленькіх дзяцей катацца адных.**

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

# І ЗІМОЙ, І ЛЕТАМ

## Біятлонны комплекс пад Навагрудкам працягвае ўдасканальвацца

**Яшчэ нядаўна мы пісалі, як спартыўна-біятлонны комплекс «Сялец» змяніўся ў летні перыяд. Тады на базе, дзе вырасла дастаткова шмат тытулаваных спартсменаў, было пашырана біятлоннае стрэльбішча, з'явілася 20 новых механічных установак, створаны трыбуны і пабудаваны судзейскія домікі. Пасля гэтага спартыўны аб'ект правёў І этап Кубка Беларускай федэрацыі біятлона па летнім біятлоне і працягнуў свае змены да лепшага.**

novgazeta.by

У наш першы візіт дырэктар навагрудскай ДЮСШ № 1, на базе якой знаходзіцца спартыўна-біятлонны комплекс, Віктар Літвінскі казаў, што для лета база ў Сяльцы вельмі добрая, а вось у бясснежныя зімы комплексу не хапае снежнай падушкі, таму кіраўніцтва вядзе праектныя работы па далейшым развіцці спартыўнай базы. Гэтую ініцыятыву падтрымала і Федэрацыя біятлона і асабіста галоўны трэнер нацыянальнай каманды Юрый Альберс.

І вось ужо ў лістападзе ў Сяльцы пачаліся работы па ўладкаванні сістэмы штучнага снегаўтварэння. Праекціроўшчыкі не толькі ўлічылі ўсе асаблівасці ландшафту комплексу, але і вывучылі вопыт па асняжненні трасы з дапамогай снегагенератара ў «Каробчыцкім Алімпе» (Гродзенскі раён), цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі «Раўбічы» і Наваполацку.

Асняжненне будзе ажыццяўляцца з дапамогай снегагенератара, а для яго работы патрабуюцца значныя аб'ёмы вады і электрычныя магутнасці (каб з вады атрымаўся снег, трэба пад ціскам развеяць ваду, змешаную з разраджаным паветрам). Таму работы па ўладкаванні сістэмы штучнага снегаўтварэння вядуцца адразу ў некалькіх кірунках. Навагрудскае прадпрыемства меліярацыйных сістэм праводзіць ачыстку возера, вядуцца работы па ўладкаванні сістэм водазабеспячэння і электразабеспячэння па трасе. Працягваецца ўладкаванне водапрыёмнікаў і калодзежаў для забора вады і падачы ў так званую перасоўную помпавую станцыю, а затым ужо ў снежную пушку.

Фінансаванне работ, у тым ліку закупка неабходнага абсталявання, ажыццяўляецца за сродкі раённага і абласнога бюджэту. Увогуле над добраўпарадкаваннем спартыўна-біятлоннай базы «Сялец» цяпер працуе каля 10 адзінак тэхнікі. Спецыялісты адзначаюць, што самую вялікую складанасць у працы выклікаюць рухомыя грунты і падводныя крыніцы на гэтай тэрыторыі.

Плануецца, што снегагенератар зможа распыляць ваду ў радыусе ад 5 да 40 метраў, гэта значыць штучны снег дазволіць павялічыць або з нуля стварыць снежнае покрыва патрэбнай шчыльнасці і вышыні. А гэта, у сваю чаргу, гарантуе наяўнасць снежнай трасы ў любое надвор'е, нават пры плюсавых тэмпературах. Для комплексу, дзе займаецца вялікая колькасць моладзі, гэта вельмі важна, бо пастаянны снег гарантуе рэгулярны бесперапынны трэніровачны працэс і магчымасць праводзіць у «Сяльцы» біятлонныя спаборніцтвы не толькі ў летні перыяд, а цэлы год.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Экспрэс-навіны

# НА ПЯСОЧНЫЯ СТАРТЫ

**У традыцыйным спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра першы этап прэстыжнага ралі-рэйду «Дакар-2019» і іншыя актуальныя падзеі выхадных.**

**1.** ***Аляксандра Сасновіч паспяхова правяла стартавы матч на турніры ў аўстралійскім Сіднеі.*** У гульні 1/16 фіналу беларуска атрымала перамогу над расіянкай Дар'яй Касаткінай — 6:1, 6:4. У 1/8 фіналу Аляксандра згуляе з аўстралійскай тэнісісткай Прысцылай Хон.

Тым часам Арына Сабаленка пацярпела паражэнне на турніры ў аўстралійскім Сіднеі. У паядынку першага раўнда Арына, якая займае 11-е месца ў сусветным рэйтынгу, саступіла восьмай ракетцы планеты чэшцы Петры Квітавай у двух сэтах — 1:6, 5:7.

Ілья Івашка пераможна стартаваў на турніры ў аўстралійскай Канберы, у матчы 1/16 фіналу беларус перайграў аўстралійца Джэймса Фроўлі — 6:4, 1:6, 7:6. У барацьбе за выхад у чвэрцьфінал Ілья Івашка, які займае 94-е месца ў сусветным рэйтынгу, будзе сапернічаць з чылійцам Томасам Барыясам, які знаходзіцца на 333-й пазіцыі рэйтынга АТР.

**2.** ***Гоншчык беларускай каманды «МАЗ-СПОРТаўта» Аляксей Вішнеўскі ўвайшоў у дзясятку наймацнейшых першага этапу прэстыжнага ралі-рэйду «Дакар-2019».*** Стартавы этап у сталіцы Перу Ліме складаўся з 330-кіламетровага ўчастка да гарадка Піска. Працягласць спецадрэзка, які ішоў у залік гонкі, склала 84 км. У заліку грузавікоў першае месца заняў экіпаж КамАЗа Эдуарда Нікалаева. Найлепшым з беларусаў стаў Аляксей Вішнеўскі, які саступіў пераможцу 6 хв. 8 сек. і стаў дзявятым.

Сярэбраны прызёр мінулага года ў агульным заліку грузавікоў беларус Сяргей Вязовіч завяршыў выступленне 14-м з адставаннем у 10 хв. 27 сек. Трэці экіпаж «МАЗ-СПОРТаўта», Аляксандра Васілеўскага, заняў 17-ю пазіцыю ў выніковым пратаколе.

Марафон «Дакар-2019» праходзіць па тэрыторыі Перу. Ралі-рэйд зойме 11 дзён і завершыцца 17 студзеня ў Ліме. Гоншчыкам трэба будзе праехаць каля 5 тыс. км. Больш чым палова маршруту пралягае праз пясчаныя трасы з вялізнымі дзюнамі і іншымі перашкодамі.

**3.** ***Мужчынская зборная Беларусі па валейболе саступіла на выездзе камандзе Іспаніі з лікам 0:3 і пацярпела першае паражэнне ў кваліфікацыі да чэмпіянату Еўропы 2019 года.*** Нягледзячы на паражэнне, за кошт большай колькасці перамог (4-1) зборная Беларусі захавала першае месца ў турнірнай табліцы: Беларусь — 11 ачкоў (5 матчаў), Іспанія — 11 (5), Нарвегія — 8 (5), Грузія — 0 (5).

Заключны тур адбудзецца 9 студзеня, наша каманда ў Осла згуляе з Нарвегіяй, а іспанцы ў Тбілісі сустрэнуцца з Грузіяй.

**4.** ***Валейбалісткі «Мінчанкі» пацярпелі паражэнне ад «Зарэчча-Адзінцова» ў гасцявым матчы з лікам 1:3 у чэмпіянаце Расіі ў суперлізе.*** Беларуская і падмаскоўная каманды ўжо сустракаліся ў гэтым сезоне на папярэдняй стадыі Кубка Расіі, і падапечныя Віктара Ганчарова таксама двойчы пацярпелі паражэнне.

Наступны матч расійскай суперлігі валейбалісткі «Мінчанкі» згуляюць на сваёй пляцоўцы ва «Уручы» 9 студзеня з лідарам чэмпіянату — калінінградскім «Лакаматывам».

**5.** ***Беларускія атлеты 18 студзеня правядуць матчавую сустрэчу па боксе, прымеркаваную да 90-годдзя айчыннай школы бокса, супраць сапернікаў з Францыі і Чэхіі.*** Турнір пройдзе ў цэнтральным атрыуме гандлёвага цэнтра «Сталіца». Для беларускіх спартсменаў гэты турнір стане адным з вырашальных этапаў падрыхтоўкі да II Еўрапейскіх гульняў, а таксама ліцэнзійнага чэмпіянату свету па боксе, які пройдзе ў верасні 2019 года ў Екацярынбургу.

Усяго за ўзнагароды турніру пазмагаюцца 29 атлетаў.

**6.** ***Хакеісты мінскага і рыжскага «Дынама» правядуць матч чэмпіянату КХЛ на адкрытым паветры 15 лютага***. Гульня адбудзецца ў Рызе, білеты паступяць у продаж 9 студзеня. Нагадаем, годам раней мінчане атрымалі ў сталіцы Латвіі перамогу з лікам 3:2.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Чулі?!

# У ВЫГЛЯДЗЕ ВЯЛІЗНАГА ДЖЫПА

## Мінскі аўтамабільны завод прадстаўляе свой першы спартыўны капотны грузавік магутнасцю 960 «коней»

**Пасля серыі выпрабаванняў каманда «МАЗ-СПОРТаўта» плануе выкарыстаць яго для ўдзелу ў міжнародных ралі-рэйдах, паведамілі ў прэс-службе аўтазавода. Спартыўны грузавік МАЗ-6440RR узяў самае лепшае ад трох аўтамабіляў. Шасі дасталася ад загартаванай ралі-рэйдамі баявой машыны МАЗ-5309RR, вялікая кабіна — ад серыйнага «працавітага» МАЗ-5440, а капот — ад цягача МАЗ-6440РА. Навінка атрымала абноўленую платформу, якая для большай лёгкасці абабітая сэндвіч-панэлямі з шклапластыку.**

Грузавік адрознівае капотная кампаноўка. Зрушэнне кабіны ў цэнтральную частку дазволіла палепшыць разважванне аўтамабіля, разгрузіць пярэдні мост і знізіць нагрузкі на экіпаж. Тым самым пілоту стане прасцей кіраваць аўтамабілем, а гоншчыкі будуць адчуваць меншыя вібрацыі, што дазволіць берагчы сілы на важных спецучастках.

Знешне грузавік нагадвае велізарны джып і не паўтарае ні адзін ралійны аўтамабіль у свеце. «Нічога такога яшчэ не рабілі. Мы пастараліся стварыць адзін з самых прыгожых спартыўных грузавікоў у гісторыі. Ён не толькі магутны і манеўраны, але і эфектна выглядае. Падчас буйных ралі-рэйдаў увага яму забяспечана, што, у сваю чаргу, дасць магчымасць яшчэ лепш прасоўваць брэнд МАЗ у свеце», — лічыць **кіраўнік каманды «МАЗ-СПОРТаўта» Сяргей ВЯЗОВІЧ.**

Капотнік атрымаўся невысокім і кампактным для грузавіка. Яго даўжыня — 7,05 м, шырыня — 2,55 м, вышыня — 3,4 м, а колавая база — 4,3 м. Маса аўтамабіля з запаснымі коламі і экіпажам — 9,6 тоны. «Каміён» аснашчаны 6-цыліндравым рухавіком Gyrtech G-13. Паліўны бак разлічаны на 1000 літраў. МАЗ-6440RR адпавядае тэхнічным рэгламентам усіх міжнародных гонак.

«Аўтамабіль спраектаваны канструктарамі Мінскага аўтамабільнага завода. Потым работнікі МАЗа дапамагалі ўсё гэта рэалізаваць. Мы лічым, што паспяховае выступленне каманды на ралі-рэйдах — гэта перш за ўсё прасоўванне беларускага вытворцы», — растлумачыў **камерцыйны дырэктар завода Генадзь СКІТАЎ.**

Увесну для новай машыны пачнецца серыя выпрабаванняў ва ўмовах бездарожжа. Пасля гэтага яго выпрабуюць на ралі-рэйдах і, калі ён сябе праявіць, адправяць на «Дакар-2020». Акрамя таго, на капотным аўтамабілі праверацца розныя тэхнічныя ноу-хау. Пасля яны могуць знайсці прымяненне на спартыўных і серыйных грузавіках МАЗ.

«Капотнік у першую чаргу створаны, каб перамагаць. Але мы таксама будзем выкарыстоўваць яго для праверкі тэхнічных навінак у экстрэмальных умовах, — растлумачыў кіраўнік спартыўнай каманды. — Зараз каманда «МАЗ-СПОРТаўта» ўваходзіць у лік фаварытаў міжнародных ралі-рэйдаў. Са з'яўленнем капотніка мы не толькі зможам павысіць нашы шанцы на поспех, але і прадэманструем канструктарскія магчымасці Мінскага аўтазавода».

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Дабрабыт» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **здания котельной** общей площадью **111,8 кв. м,** инв. № **624/С-13157, трех котлов «Энергия-6», инв. №№ по бух. учету 43422, 43421, 4119, автоматики АГК-2У, инв. № по бух. учету 42330, насоса К90*35 консольного, инв. № по бух. учету 43420, насоса КМ80*50 консольного моноблочного, инв. № по бух. учету 43419 и насоса ЭЦВ 6-6,0, инв. № по бух. учету 43291**, расположенных на земельном участке с кадастровым номером **624250100001004652** (предоставлен на праве постоянного пользования) площадью **0,0732 га**, по адресу: **Минская область, Несвижский район, г. Несвиж, ул. Ленинская, 115.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **15 946,80** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **1 594,00** бел. руб.).

Условия продажи:

в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на Объект (в случае отчуждения объекта, государственная регистрация создания которого не производилась, – с даты подписания акта о приеме-передаче) проинформировать районный исполнительный комитет об отсутствии необходимости получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ;

обеспечить безопасность и ограничение доступа на Объект с момента подписания акта о приеме-передаче;

навести на земельном участке, отведенном для обслуживания Объекта, порядок в течение одного месяца с момента подписания сторонами акта о приеме-передаче;

привести Объект в надлежащее санитарное, техническое состояние в течение двенадцати месяцев с момента подписания акта о приеме-передаче;

в случае необходимости проведения работы, требующей изготовления проектно-сметной документации (проектирование, возведение, реконструкция, реставрация, капитальный ремонт, благоустройство либо снос):

обратиться в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ не позднее шести месяцев с даты государственной регистрации перехода права собственности на Объект (в случае отчуждения объекта, государственная регистрация создания которого не производилась, – с даты подписания акта о приеме-передаче);

начать разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в течение одного месяца с даты получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ;

осуществить реконструкцию (строительство), реставрацию, капитальный ремонт, благоустройство либо снос Объекта в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

обеспечить безопасность и ограничение доступа на Объект с момента подписания акта о приеме-передаче;

использовать земельный участок в соответствии с действующим законодательством;

поддерживать надлежащее санитарное, техническое состояние Объекта и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) Объекта до его сноса (гибели);

запрет на отчуждение Объекта до выполнения Покупателем условий договора купли-продажи (за исключением случаев отчуждения, передачи без перехода права собственности объекта Покупателем, являющимся физическим лицом, созданному им субъекту хозяйствования, либо использования объекта при регистрации физического лица в качестве индивидуального предпринимателя).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **14.02.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.02.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

## Сведения о земельном участке, предлагаемом на аукционе 20.02.2019 г.

| № | Место и дата проведения аукциона | Предмет аукциона, вид вещного права | Место, дата, время начала и окончания приема заявлений | Кадастровый номер, целевое назначение, адрес, площадь земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Затраты по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителем, руб. | Размер задатка руб. и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета | Инженерная и транспортная инфраструктура |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Зал заседания Микашевичского горисполкома, Брестская область, Лунинецкий район, город Микашевичи, ул. Ленинская, 10, **20.02.2019 г. в 11.00** | За право заключения договора аренды земельного участка (срок 49 лет) | Микашевичский горисполком, г. Микашевичи, ул. Ленинская, 10, кабинет управляющего делами. Дата и время начала приема заявлений: **14.01.2019 г. с 8.00 до 13.00 с 14.00 до 17.00;** дата и время окончания приема заявлений **14.02.2019 г. с 8.00 до 13.00 с 14.00 до 17.00** тел. 8 (01647) 6-87-36; 6-82-43 | 124751000001003535, земельный участок для строительства и обслуживания объекта промышленного производства и (или) административного назначения и (или) автостоянки и гаражей по ремонту и обслуживанию автомобилей и (или) объекта по оказанию услуг, расположенный по адресу: Брестская область, Лунинецкий район, город Микашевичи, ул. Маяковского, 30В. Площадь земельного участка – 0,9839 га | 37943 руб. 91 коп. | 3355 руб. 45 коп. | 10 % (3794 руб. 39 коп.) р/с BY08 AKBB 3600 2210 9199 1000 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК банка AKBBBY2X, УНП 200676206, код платежа – 04002 | Возможность подключения электрических сетей, водоснабжения, к сетям газоснабжения, теплоснабжения |

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении первого повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего частного предприятия «Аналитик-центр» в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе:

**Имущество ОАО «Молодечнолес»**

| № Лота | Наименование объекта, сведения о земельном участке (площадь, кадастровый номер) | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Размер задатка (10 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Недвижимое имущество** | | |
| 1 | **погреб пустоблочный** *(инв. № по бух. учету 11-091)*, общ. пл. 43,6 кв. м, инв. № 622/С-41031, **здание столовой** *(инв. № по бух. учету 11-090)*, общ. пл. 175,5 кв. м, инв. № 622/С-41030, **склад продовольственный** *(инв. № по бух. учету 11-092)*, общ. пл. 52,6 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 625483402101000129 площадью 0,1728 га по адресу: Минская область, Столбцовский район, Налибокский с/с, д. Клетище. На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона линии электропередачи до 1000 В *(0,0046 га)* | **10 054,37** | 1 005,00 |
| 2 | **здание конторы** *(инв. № по бух. учету 01-086)*, общ. пл. 167,9 кв. м, инв. № 622/С-41032, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625483402101000130 площадью 0,3271 га по адресу: Минская область, Столбцовский район, Налибокский с/с, д. Клетище. На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона линии электропередачи до 1000 В *(0,0283 га)* | **1 220,74** | 122,00 |
| 3 | **здание мастерской** *(инв. № по бух. учету 05-529)*, общ. пл. 855,7 кв. м, **пожарный сарай** *(инв. № по бух. учету 01-098)*, общ. пл. 111,2 кв. м, **склад** *(инв. № по бух. учету 01-100)*, общ. пл. 147,6 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 625483402101000131 площадью 2,7827 га по адресу: Минская область, Столбцовский район, Налибокский с/с, д. Клетище. На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона линии электропередачи до 1000 В *(0,0437 га)* | **23 815,33** | 2 381,00 |
| 4 | **здание столовой** ***(в состав входят: столовая, склад, погреб, навес, сарай)*** *(инв. № по бух. учету 11-034)*, общ. пл. 169,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 621350100007001973 площадью 0,4010 га по адресу: Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, ул. 1 Мая, д. 106 | **23 970,68** | 2 397,00 |
| 5 | **здание конторы – диспетчерской (в состав входят: контора, сарай, уборная)** *(инв. № по бух. учету 01-012, 11-467)*, инв. № 631/С-13512, общ. пл. 120 кв. м, **здание мастерской и конторы,** инв. № 631/С-13513, *(инв. № по бух. учету 01-029)*, общ. пл. 615,7 кв. м, **здание заправки** *(инв. № по бух. учету 01-197)* общ. пл. 31,8 кв. м, **здание котельной** *(инв. № по бух. учету 01-198)* общ. пл. 145,4 кв. м, **склад** *(инв. № по бух. учету 11-466)* общ. пл. 121,4 кв. м, **склад** *(инв. № по бух. учету 01-196)*, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 621350100007001972 площадью 1,7384 га по адресу: Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 106 | **272 999,50** | 27 299,00 |
| 6 | **здание РММ** *(инв. № по бух. учету 01-184)*, общ. пл. 972,1 кв. м, **здание конторы** (*инв. № по бух. учету 01-178*), общ. пл. 110 кв. м, **здание склада** (*инв. № по бух. учету 01-179*), общ. пл. 253,4 кв. м, **здание арочного сооружения** (*инв. № по бух. учету 05-574*), общ. пл. 136,8 кв. м, **здание столовой** (*инв. № по бух. учету 01-019*), общ. пл. 64,5 кв. м, **здание столовой** (*инв. № по бух. учету 11-153*), общ. пл. 135,3 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 224050100002000633 площадью 1,3286 га по адресу: Витебская область, г. Поставы, ул. Вокзальная | **95 141,42** | 9 514,00 |
| | **Транспортная техника** | | |
| 7 | **автомобиль MAZ-5434 03**, 2008 года выпуска, грузовой специальный лесовоз, цвет – белый, регистрационный знак АК 7954-5, кузов (шасси, рама) № Y3M54340380000611, свидетельство о регистрации транспортного средства серии ОЕА № 136638 *(инв. № по бух. учету 05-444)*. Транспорт находится по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул.1 Мая, 106 | **3 428,24** | 342,00 |
| 8 | **автомобиль MAZ-5434 03-220**, 2007 года выпуска, грузовой специальный лесовоз, цвет – белый, регистрационный знак АВ 7199-5, кузов *(шасси, рама)* № Y3M54340370000444, свидетельство о регистрации транспортного средства серии ОЕА № 059029 *(инв. № по бух. учету 05-322)*. Транспорт находится по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул.1 Мая, 106 | **3 428,24** | 342,00 |
| 9 | **автомобиль MAZ-5434**, 1998 года выпуска, грузовой лесовоз, цвет – белый, регистрационный знак ОА 5319, кузов *(шасси, рама)* № Y3M54340X0000631, свидетельство о регистрации транспортного средства серии РЕ № 003714 *(инв. № по бух. учету 08-029)*. Транспорт находится по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул.1 Мая, 106 | **3 428,24** | 342,00 |
| 10 | **прицеп MAZ-900810-012**, 2009 года выпуска, специальный роспуск, цвет – серый, регистрационный знак А 9826 А-5, кузов *(шасси, рама)* № Y3M90081090000036, свидетельство о регистрации транспортного средства серии ОЕА № 136637 *(инв. № по бух. учету 08-613)*. Транспорт находится по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 106 | **3 199,69** | 319,00 |
| 11 | **прицеп MAZ 900810-012**, 2009 года выпуска, специальный роспуск, цвет – серый, регистрационный знак А 9827 А-5, кузов *(шасси, рама)* № Y3M90081090000042, свидетельство о регистрации транспортного средства серии ОЕА № 136658 *(инв. № по бух. учету 06-614)*. Транспорт находится по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 106 | **3 199,69** | 319,00 |
| 12 | **прицеп ГКБ 9362**, 2000 года выпуска, роспуск, цвет – черный, регистрационный знак 4295 ОМ, кузов не зарегистрирован, свидетельство о регистрации транспортного средства серии РЕ № 005579 *(инв. № по бух. учету 08-466)*. Транспорт находится по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Виленская, 24 | **2 971,14** | 297,00 |

**Оборудование, малоценные быстро снашивающиеся предметы**

| № лота | Наименование объекта | Инвентарный номер согласно данным бухучета | Начальная цена с НДС бел. руб. | Сумма задатка (10 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 13 | Бензопила | 05-992 | 186,44 | 18,00 |
| 14 | Компьютер (ПЭВМ, монитор ЖК) | 07-215 | 64,37 | 6,00 |
| 15 | Компьютер (ПЭВМ, монитор ЖК) | 07-213 | 59,93 | 5,00 |
| 16 | Компьютер SAMSUNG | 07-082 | 133,18 | 13,00 |
| 17 | Компьютер Селерон | 07-061 | 39,95 | 3,00 |
| 18 | Принтер Canon MF44101зав. № 79183 | 07-218 | 110,98 | 11,00 |
| 19 | ПЭВМ Сильверадо | 07-211 | 79,90 | 7,00 |
| 20 | ПЭВМ Сильверадо LG | 07-210 | 79,90 | 7,00 |
| 21 | Факс Панасоник | 09-314 | 75,46 | 7,00 |
| 22 | Факс Панасоник | 09-315 | 75,46 | 7,00 |
| 23 | Факс Панасоник | 09-156 | 39,95 | 3,00 |
| 24 | Брусовочный станок | 05-689 | 5 770,72 | 577,00 |
| 25 | Вальцовочный правильный станок | 05-694 | 1 220,74 | 122,00 |
| 26 | Заточный станок РРТ-1000 | 05-697 | 2 885,36 | 288,00 |
| 27 | Круглопильный станок Пауль | 05-692 | 8 343,13 | 834,00 |
| 28 | Круглопильный станок Пауль | 05-680 | 5 104,87 | 510,00 |
| 29 | Шлифовальный станок РР-1000 | 05-696 | 2 885,36 | 288,00 |
| 30 | Электротельфер | 5-893 | 377,32 | 37,00 |
| 31 | Набор «Премьер-1» | 09-152 | 95,44 | 9,00 |
| 32 | Установка для напайки | 05-695 | 1 797,80 | 179,00 |
| 33 | Мебель (столы, стулья, шкафы) в том числе: стол кабинетный, стул (3 шт.), шкаф для одежды (2 шт.), шкаф для одежды (12 шт.), печь СВЧ б/у, печь СВЧ б/у, стенд, тележка гидравлическая | – | 710,24 | 71,00 |
| 34 | Оргтехника, в том числе: многофункциональное устройство HP Laser Jet Pro M, Телефакс Panasonic 982 | – | 153,14 | 15,00 |
| 35 | Спецодежда, в том числе: брюки DYNAMIC (1 шт.), каска защитная (10 шт.), костюм (куртка, брюки) (11 шт.), куртка STANDART (1 шт.), сапоги резиновые ECONOMY (1 шт.). | – | 599,27 | 59,00 |
| 36 | Набор мягкой мебели «Вивальди» | 09-377 | 42,18 | 4,00 |
| 37 | Набор мягкой мебели «Жасмин» | 09-379 | 54,49 | 5,00 |
| 38 | Набор мягкой мебели «Оазис» | 09-378 | 54,49 | 5,00 |
| 39 | Котел стационарный | 04-095 | 19,98 | 2,00 |
| 40 | Трансформатор ТС-10Кв | 04-096 | 599,27 | 59,00 |
| 41 | Шкаф КТП-25/10 | 04-087 | 288,53 | 28,00 |

**Стоимость снижена на 10 %.**

В соответствии с абзацем 4 п. 1.2 Указа Президента Республики Беларусь от 05.02.2013 № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)», государственная регистрация создания капитальных строений, которые выставлены на торги без наличия документов, будет осуществляться в установленном порядке по заявлению покупателя и за его счет.

Шаг аукциона – 10 (десять) процентов.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона.**

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

– заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

– для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

– для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

– для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

– для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов, ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 18.10.2018.

Аукцион состоится **30.01.2019 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.01.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

Лёсы людскія

# «НІЗКІ ПАКЛОН ТАБЕ, ДОКТАР!»

**Вось ужо 75 гадоў у нашай сям'і захоўваецца невялікі, пажаўцелы лісток паперы — дакумент, дзякуючы якому маю любую мамку не вывезлі ў Нямеччыну. Яна засталася дома, выйшла замуж за нашага бацечку Рыгора Паўлавіча. Разам яны нарадзілі і вырасцілі пяцёра дзяцей, у якіх ужо свае дзеці і свае ўнукі. Цяжка ўявіць, што гэтага дружнага роду магло б, крый бог, і не быць, калі б...**



Маленькая вёсачка Рудня, што на Магілёўшчыне, размяшчалася на мяжы Крычаўскага і Клімавіцкага раёнаў. У 41-м немцы вельмі хутка захапілі нашы мясціны, хоць пад Крычавам баі былі цяжкія. У лесе да сёння шмат акопаў, людзі знаходзілі зброю.

Немцы стаялі ў суседняй вёсцы Лобжа, цэнтры сельсавета. Там жа размяшчаўся і паліцэйскі гарнізон, які ўзначальваў (хто б мог падумаць?) адзін з «адказных работнікаў» калгаса. Я знарок не называю ягонае прозвішча, каб не прычыніць боль родным, што яшчэ жывуць паміж нас.

А Рудня, нягледзячы на вайну, жыла, можна сказаць, сваім звычайным жыццём: людзі аралі зямлю, сеялі хлеб, касілі, спраўлялі вяселлі, нараджалі дзяцей, моладзь ладзіла вячоркі.

Немцы наязджалі на веласіпедах па два-тры чалавекі. Ішлі па хатах, патрабавалі яйкі, масла ды сала. Больш нахабна і жорстка паводзілі сябе паліцаі. Яны трымалі ў страху і дарослых, і дзяцей, ператрасалі ўсё ў хатах ды пунях, раскідвалі стагі і падушкі, стралялі ў столь — шукалі збеглых палонных і партызанаў. А яны ў вёсцы былі з першых дзён вайны. Часам на сценах хат з'яўляліся лістоўкі з ваеннымі звесткамі. «Масква наша! Ленінград не здаецца!» — шэптам перадавалі адзін аднаму вяскоўцы. Было зразумела, што «маланкавая вайна» правалілася.

З боку Крычава вёска была відаць як на далоні, і таму на кожны масавы рух жыхароў (касьба, выбіранне бульбы і г. д.) ляцеў снарад. Насупраць нашай хаты ад яго захавалася яміна. Яе нават не спрабавалі засыпаць. А многія снарады траплялі ў багну і не ўзрываліся.

Пасля пачатку наступлення нашых войскаў пад Сталінградам фашысты пачалі лютаваць. Паліцаі ім дапамагалі. З асаблівай жорсткасцю адбіралі скаціну, збожжа. А неўзабаве пакаціліся аблавы на моладзь. Па спісах, складзеных старастам-паліцаем, у адну са снежаньскіх раніц з хат павыганялі хлопцаў і дзяўчат, пагналі ў райцэнтр, у Клімавічы.

Трапіла ў тыя спісы і мая будучая мама — 19-гадовая Клаўдзія Курачова. Медыцынская камісія адбірала самых здаровых і прыгожых. Для гэтага ўсіх распраналі дагала (дзяўчаты нават страчвалі прытомнасць ад сораму) і ганялі па дактарах — з кабінета ў кабінет. Напрыканцы выносіўся вердыкт: годны ці не.

У першы раз маю маму выратавала нямецкая педантычнасць. У назве вёскі было напісана «Родня» замест «Рудня», з-за чаго і прагучала выратавальнае «Вэк»... Мама казала, што, пачуўшы яго, усе 12 кіламетраў да дома бегла і плакала, паўтараючы два словы: «Хрыстос Уваскрос!». Так вучыла яе бабуля, так матуля вучыла потым нас. Іншых малітваў мы не ведалі.

А ўжо ў пачатку лютага 1943-га паліцаі зачыталі новыя спісы, прызначылі новы дзень і месца збору моладзі. Пры гэтым пагрозліва абвясцілі, што, калі нехта не з'явіцца, расстраляюць родных.

Мамін бацька, а мой, значыць, дзед Сямён, тады паехаў у горад шукаць нейкага паратунку. І добрыя людзі падказалі яму, што сярод нямецкіх дактароў ёсць і наша, савецкая: яна можа даць патрэбную даведку аб стане здароўя.

Позна ўвечары дзед знайшоў дом, дзе доктар Вараб'ёва з пяцігадовай дачушкай здымала пакой (муж-афіцэр быў на фронце, а яе, можа, прымусілі працаваць? Ды і жыць жа за нешта ж трэба было)...

Дзядуля са слязамі на вачах выказаў жанчыне сваё гора, прапанаваў і плату — бохан хлеба і кавалак сала. Жанчына абяцала дапамагчы. І, дзякаваць богу, слова сваё стрымала: калі ў другі раз моладзь прывезлі ў бальніцу, мама знайшла вачыма патрэбную жанчыну (маладую, з прыгожымі чорнымі валасамі), падышла да яе, назвала сваё прозвішча... Доктар тады і выпісала вось гэтую самую даведку. А мама, пачуўшы гартаннае нямецкае «кранк» (хвора) ды балючы штуршок у спіну, зноў апынулася на вуліцы. Зноўку бегла, плакала і дзякавала Богу.

Здраднік-паліцай тады аж счарнеў ад злосці. Ён добра ведаў, што дзяўчына здаровая. Прыйшоў у хату і сказаў дзеду, што ў наступны раз павязе маму сам — болей не адкруціцца.

Моладзь, каб неяк уратавацца ад вывазу, спрабавала рознае: газай націралі рукі, самі сабе наносілі раны ды пасыпалі соллю, нешта капалі ў вочы і вушы... Вёска застыла ў цяжкім чаканні. І вось 29 жніўня. Моладзь пад дуламі паліцэйскіх аўтаматаў зноў павялі ў Клімавічы. Але на шчасце гэту працэсію ў лесе ўжо чакала партызанская засада. Паліцаяў і старасту расстралялі. Хлопцы і дзяўчаты вярнуліся дамоў у вёску, на якую праз месяц абрынулася новая бяда: «набожныя» фашысты на Узвіжанне сталі гойсаць ад хаты да хаты, паліваць сцены газай і падпальваць...

Дзед Паўлюк, убачыўшы, што злыдні трохі адбегліся, стаў заліваць вадою агонь... Праўда, нічога добрага з гэтага не выйшла. Немцы, якія пільна за ўсім сачылі, вярнуліся назад, схапілі дзеда за каўнер і кінулі... у дзверы палаючай хаты.

Вёскі не стала гадзіны за дзве. А дзед Паўлюк — выжыў. Толькі з таго дня стаў часта траціць прытомнасць і праз тры гады заўчасна памёр.

Тым часам савецкія войскі хутка набліжаліся да беларускай мяжы. У канцы верасня 1943 года былі вызвалены чыгуначная станцыя і горад Клімавічы.

Назаўтра ж пасля вызвалення дзед Сямён кінуўся туды, каб яшчэ раз падзякаваць доктару Вараб'ёвай, але не заспеў яе. Бабуля, у якой яна здымала пакой, апусціўшы вочы, сказала, што ні пра кватарантку, ні пра яе дзіця нічога не ведае. Жанчына быццам знікла. Магчыма, яе проста арыштавалі за «супрацоўніцтва з немцамі»? Такое ж тады вельмі часта здаралася... А мы вось жывём і помнім яе.

Нізкі паклон вам, доктар Вараб'ёва!

**Наталля Сівак,**
*в. Заполле, Чэрвеньскі раён.*

Так ці не?

# КОСЦЬ БЫВАЕ БЕЛАЯ... А КОСТКА — НЕСВЯНЦОНАЯ

**«Часта чую выраз «вскрытие покажет», і ў рускай мове ён мяне зусім не бянтэжыць, — піша спадарыня Марыя Хмара, — а вось у беларускай... Ці правільна казаць, што «пакажа ўскрыццё»? І яшчэ дзве просьбы з таго ж канверта: растлумачыць, чым адрозніваецца «косць» ад «косткі» і што азначае бабуліна «дзень ада дня»?**

**Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь Саламевіч і Леў Глушыцкі.**

1. Тое, што па-руску называецца *вскрытие* (у медыцынскім сэнсе), у беларускай літаратурнай мове і мела, і мае назву **анатамаванне** (ад дзеяслова **анатамаваць**). Менавіта гэтыя словы мы і раілі б да выкарыстання. Што да згаданага чытачкай *ускрыцця*, то яно з'явілася пад уплывам рускай мовы і, на жаль, нават «прапісалася» ў некаторых слоўніках.

2. Словы **косць** і **костка** маюць у нашай мове роўныя правы. Але трэба ведаць і пра адрозненні. У анатоміі прыняты тэрмін **косць**. Таму, пішучы альбо разважаючы на медыцынскую тэматыку, трэба выкарыстоўваць гэтае слова. Адрознае ад яго **костка** выкарыстоўваецца ў выпадках, якія не патрабуюць трымацца тэрміналогіі альбо калі гаворка ідзе не пра чалавечыя косці. Прыгадаем, напрыклад, Купалаву «Паўлінку»: *Дык чаго ж ты, тудэма-сюдэма, несвянцоная костка, рассеўся, як у сваёй хаце!*

Тут варта яшчэ звярнуць увагу на ўстойлівыя выразы. Напрыклад, *слановая косць* (а не *костка*), *скура ды косці* (а не *косткі*), але: *як костка ў горле* (а не *косць*).

3. Слова **дзень** у нашай мове ўжываецца ў шматлікіх выразах. Многія з іх падобныя да рускіх адпаведнікаў: *дзень за днём* і *дзень ада дня* (з кожным днём, паступова), *з дня на дзень* ('у самы бліжэйшы час') і г. д. Але ёсць і цікавыя выпадкі, калі ў дзвюх мовах могуць выкарыстоўвацца адрозныя варыянты:

в один день (зрабіць нешта) — **за адзін дзень, аб дзень;**

в один прекрасный день — **аднаго разу, аднаго дня, аднойчы;**

день-деньской — **цалюткі (цэлы) дзень, з раніцы да вечара;**

изо дня в день — **дзень пры дні, дзень у дзень;**

на днях — **гэтымі днямі** (калі гаворка пра мінулае, ужываецца слова **надоечы**).

## У абарону слоў

У Навагоддзе ў сувязі са шматлікімі святамі не раз гаварылася і пісалася пра адпраўленне і ўручэнне паштовак. Тэма як быццам добра вядомая, і ўсе словы, якія мы выкарыстоўваем, здавалася б, прывычныя. Але адно з іх апошнімі гадамі ўсё ж крыўдзяць: **канверт**, які доўгія дзесяцігоддзі служыў нам верай і праўдай, сёння часцяком замяняюць варыянтам *капэрта*, хоць рабіць гэта наўрад ці варта, бо *канверт* (у тагачасным напісанні *канвэрт*) фіксаваўся яшчэ ў дарэформенных (да 1933 года) слоўніках. Ёсць гэта слова і ў творах класікаў нашай літаратуры. Таму карыстаймася ім без сумненняў!

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

Рэзананс

# СЯРОД ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

**Асалода чытаць па-беларуску (у тым ліку — «Звязду»), асалода пісаць. На гэты раз узяцца за пяро прымусілі дзве публікацыі. Першая — Алены Ляўковіч пра паштоўкі як люстэрка часу. Іх некалі і сапраўды прысылала радня, падпісвалі вучні (я працавала настаўніцай), і таму цяпер проста рука не падымаецца нешта выкінуць. Часам перабіраю, разглядаю і наплываюць такія ўспаміны...**

А другая — «нефармат» Святланы Яскевіч «Найвялікшае шчасце». Гэта і наогул як быццам пра мяне, бо я таксама ляжала ў траўматалогіі, таксама выпісалася адтуль за два дні да Новага года. Да таго ж разам са мной ляжала жанчына з пераломам пазваночніка: яна палезла павесіць цюль ды і навярнулася, як той казаў... Да яе штодня прыходзілі то сын, то нявестка, даглядалі, мылі. Розніца толькі ў тым, што ўсё адбывалася ў нас, у Гродне.

Сустаў, які мне замянілі там, служыць верай і праўдай, за што хочацца шчыра падзякаваць хірургу Міхаілу Рыгоравічу Малкіну. А далечваў мяне другі ўрач — Іван Міхайлавіч Ганчарук... Грэх не ўспомніць і сваіх, смаргонскіх медыкаў, асабліва — Наталлю Вячаславаўну Курбацкую. Каторы гадок я ў яе на ўліку...

Ды і наогул, пакуль не скруціла хвароба, я не ведала, што навокал так многа добрых людзей. Ні разу не было такога, каб хто-небудзь не кінуўся мне дапамагчы: і падвезці прапануюць, і падвезці.

...А перад Новым годам і наогул свята было! На яго мяне запрасілі мае апошнія выпускі. Адна дзяўчынка (яны для мяне пажыццёва дзяўчаткі) прыехала з Калінінграда, і сабраліся разам Алеся Невяровіч, Каця Ерамеева, Таня Вяль, Марына Бурачэўская, Вольга Ількевіч, Наташа Майсевіч... Мяне таксама ў кафэ прывезлі (нашай школы даўно няма), падарылі такі букет, напісалі такія пажаданні...

Вось і думаю: а хай бы нейкі год у нас стаў Годам дабрыні ці добрых спраў!

**Г. У. Пятроўская,**
*г. Смаргонь.*

Смех смехам

# НАРАДЖЭННЕ ПАЭТКІ

**...Калі на свет з'явілася наша дачушка Ганначка, мы з жонкай завялі спецыяльны сшытак, куды сталі запісваць «этапы росту» — першыя дасягненні дзяўчынкі, смешныя выпадкі, незвычайныя словы — усё, што «генеруе» яе нястомная фантазія. Апошнім часам, напрыклад, наша дачка палюбіла рыфмы. Выдала неяк:**

*«Я прачнулася зарана*
*І глядзела на барана».*

Напэўна, убачыла на палічцы кніжку казак з яго выявай, а можа... мяне, бо па гараскопе я — якраз ён.

Ёсць, карацей, над чым падумаць.

Занатоўвалі за малой і нешта бессэнсоўнае — на першы погляд:

*«Мы прыйшлі і паглядзелі:*
*Усе арэлі захварэлі».*

Можа, скрыгат падаўся праявай хваробы?.. А яе «бабуля-Натуля — цёплаю кашуляй»? А «тата Жэня — вялізазным пельменем»?

Вось гэта, на жаль, таксама пра мяне. Нават крыўдна стала! А з іншага боку, за што крыўдаваць?.. Трэба зноў пачаць бегаць ці менш налягаць на яечню, асабліва нанач, каб не быць тым «пельменем»!

…«Спатыкнулася» дзіця хіба на дзядулю Ігара, які ну ні з чым не рыфмаваўся! Аж заплакала, беднае, але ж нашых падказак не прыняло. І што важна, не адступілася: праз некалькі гадзін, калі мы ўжо і забыліся на гэтую гульню, раптам закрычала: «Тыгр! Тыгр!» «Які, — пытаем, — тыгр і адкуль?» А малая нам: «Дзеда Ігар — ён жа тыгр! Я сама прыдумала!»

«Паэтка расце!» — не без гонару адзначылі мы з жонкай і пакаціліся са смеху.

**Яўген Мартыновіч,**
*г. Мінск.*

# НАСМАРК — НЕ ДРОБЯЗЬ!

**У халады рыніт (а папросту насмарк) становіцца частым і нават звыклым госцем для дарослых і дзяцей. Часам мы на яго і ўвагі не звяртаем, хіба што глушым каплямі. Ці трэба так рабіць?**

Банальны насмарк (ці востры неспецыфічны) з'яўляецца запаленнем слізістай носа. І садзейнічаюць яго развіццю пераахалоджанне, зніжаная імунная сістэма, кантакт з хворымі на вострыя вірусныя рэспіраторныя хваробы (парагрып, грып, адэнавірус і інш.), а таксама ўнясенне ў насавую поласць патагенных мікраарганізмаў.

— Існуе шырока распаўсюджанае памылковае меркаванне, што немэтазгодна лячыць востры рыніт. Маўляў, лячы — не лячы, менш чым за тыдзень не пройдзе. Але пацыентам, якія кіруюцца такім стэрэатыпам, даводзіцца сутыкацца з ускладненнямі ў выглядзе запалення калянасавых пазух і сярэдняга вуха, дыхальных шляхоў — фарынгаларынгатрахеабранхітам, а таксама хранізацыі гэтых працэсаў, — папярэджвае **загадчык 3-га педыятрычнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Людміла КІПЦЭВІЧ.** — Бацькам важна ведаць, да чаго можа прывесці парушэнне насавога дыхання на фоне частага ці доўгага насмарку ў дзяцінстве. Гэта парушэнні сну, хуткае ператамленне, зніжэнне памяці, парушэнне работы органаў дыхання і сардэчна-сасудзістай сістэмы, працэсаў метабалізму аж да спынення разумовага і фізічнага развіцця дзіцяці, дэфармацыі шкілета твару.

Пры своечасовым і правільным лячэнні насмарк доўжыцца ад 7 да 10—12 дзён. І важна своечасова звярнуцца да ўрача па дапамогу. Можна лячыць насмарк і ў хатніх умовах. Для гэтага варта памятаць, што метады лячэння залежаць ад стадыі хваробы.

На першай прымяняюць адцягвальныя працэдуры: нажныя ванны, расціранне ног, а таксама патагонныя сродкі (гарбата з малінай, мёдам, ліпавым цветам), фітанцыды (удыханне здробненага часнаку, цыбулі), прымяненне гарчкапаніжальных, супрацьвірусных і антыгістамінавых прэпаратаў. На другой і трэцяй стадыях падключаюць сасудазвужальныя каплі ў нос або спрэі. Але спачатку важна ачысціць нос ад слізі, для гэтага падыдзе звычайны фізраствор, які прадаецца ў аптэках. Яго трэба закапаць у нос і праз пару хвілін ачысціць яго. І толькі пасля гэтага закапаць сасудазвужальныя каплі. На трэцяй стадыі часам дадаюць антыбіётык у выглядзе капляў ці спрэяў.

А вы ведалі?

# АД ДРЭННАГА НАСТРОЮ ДА ДЭПРЭСІІ

## Як захаваць псіхічнае здароўе ў сталым узросце

**Зімой, здаецца, сама прырода распарадзілася маркоціцца і хандрыць: дні стаяць кароткія, а сонца мы амаль не бачым. Пасумаваць пару дзён, канешне, не страшна. Але калі дрэнны настрой цягнецца тыднямі, тут размова можа ісці пра дэпрэсію. Да яе схільныя ўсё больш людзей у свеце. І паводле прагнозаў вучоных, да 2020 года яна выйдзе на другое месца па распаўсюджанасці пасля сардэчна-сасудзістых хвароб.**



Медыкі тлумачаць, што стрэс — гэта сітуацыя, у якой чалавек аказаўся ўпершыню, і ў яго яшчэ няма вопыту, як вырашыць сваю праблему, няма ведаў пра тое, якія наступствы яго чакаюць. Такая невядомасць сур'ёзна ўплывае на нервовую сістэму, але звычайна востры стан доўжыцца тры-чатыры дні, а затым праходзіць. Калі ж чалавек зноў і зноў аказваецца ў цісках абставін і выдатна ведае, чым для яго абернецца страта работы, скасаванне шлюбу ці фінансавы крызіс, і гэтыя непрыемнасці ідуць чарадой, — атрымліваецца, што ён пастаянна жыве ў стане стрэсу. І вось тут нервовая сістэма, якая не можа справіцца з непасільнай нагрузкай, дае збой. Як ні сумна, перад дэспрэсіяй, як і перад каханнем, усе ўзросты скараюцца. І людзі сталага веку — не выключэнне. Сыход з работы, адзінота і ўзроставыя хваробы толькі пагаршаюць эмацыянальны стан.

### ПРЫКМЕТЫ ДЭПРЭСІІ

Асноўнымі характарыстыкамі дэпрэсіі з'яўляюцца адчуванне стомленасці і апустошанасці, безнадзейнасці і непапраўнасці, маркоты і тугі, у гэтым стане завышана самакрытыка, прысутнічае пачуццё глыбокай віны.

— Чалавек пачынае займацца самаедствам, бясконца сябе вінаваціць, пастаянна наракаючы на абставіны і жыццё ўвогуле, часта крытыкуе навакольных і блізкіх за адсутнасць разумення яго стану, яго раздражняюць пазітыўныя людзі, ён ва ўсім шукае недахопы, ходзячы па крузе, і зноў вяртаецца да сваіх светаадчуванняў, — тлумачыць **урач-псіхатэрапеўт Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Марына ШЧАСЛЯНОК.** — Тое, што раней прыносіла задавальненне, яго ўжо не радуе, ён і хацеў бы знайсці гэтаму замену, але не атрымліваецца. Ён жыве ў сваім свеце — адзінокі і не зразумелы нікім, абыякавы да таго, што яго акружае.

Цяжкі эмацыянальны стан узмацняецца фізічнымі недамаганнямі, ці гэта будуць парушэнні функцый сардэчна-сасудзістай сістэмы і абмену рэчываў, ці бяссонніца, адсутнасць апетыту і іншае.

### УЗРОСТАВЫ КРЫЗІС

Больш складаным відам з'яўляецца ўзроставая дэпрэсія. Яна мае свае прычыны: эмацыянальны стан ускладняе пагаршэнне фізічнага здароўя, звязанае з пэўнымі ўзроставымі зменамі ў арганізме. Чалавек, які выходзіць на заслужаны адпачынак, вельмі выразна адчувае розніцу паміж сваім ранейшым ладам жыцця і цяперашнім.

Незапатрабаванасць, марнасць, адзінота і адчай становяцца спадарожнікамі пажылога чалавека. Жыццё цячэ марудна і аднастайна. У сувязі з узроставымі абмежаваннямі ўладкавацца на работу праблемна, дзеці выраслі і ў іх свае сем'і, больш за тое, ім ужо не патрэбна бацькоўская апека. Узнікаюць праблемы са здароўем, непазбежныя ўзроставыя змены знешнасці. Мяняецца і асяроддзе кантактавання.

Таму вельмі важна, каб блізкія не пакідалі без увагі сваіх пажылых бацькоў і свякоў. А тым больш не ігнаравалі стан узроставай дэпрэсіі. Ні ў якім разе нельга наракаць на ўзрост ды непазбежнасць такога стану і ў сувязі з гэтым адсутнасць метадаў лячэння. Не пакідайце чалавека на волю лёсу і сам насам з хваробай.

— Як правіла, да пажылых бацькоў мы прыходзім залечваць свае раны, калі нам цяжка. Аднак забываем, што яны таксама перажываюць і, хутчэй за ўсё, у адзіноце, — нагадвае Марына Шчаслянок.

### ЯК ЯЕ ПЕРААДОЛЕЦЬ

- Скараціце да мінімуму кантактаванне з людзьмі, якія выклікаюць у вас адмоўныя эмоцыі. Стрэс не падаўжае жыццё. Вам патрэбны станоўчыя эмоцыі. Вы іх атрымаеце, калі не будзеце замыкацца, а застаняцеся адкрытымі да кантактавання.
- Абавязкова павінен быць чалавек, які вас выслухае, паколькі вельмі важна ведаць, што вы не адзінокія. Замыкаючыся ў сабе, вы дапамагаеце назапашвацца негатыву ўнутры, адчуваючы адзіноту і непатрэбнасць. Не трэба сябе «зажыва хаваць». Кантактуйце з людзьмі пазітыўнымі, гэта надасць вам моцы і веры ва ўласныя сілы.
- Можаце заняцца прысядзібнай гаспадаркай, кветкаводствам. Гэта выдатнае спалучэнне адпачынку на свежым паветры і фізічнай актыўнасці. Можна разводзіць і хатнія расліны ці завесці хатняга гадаванца, які патрабуе любві і клопату, і прысвяціць яму свой час, падарыць цеплыню. А сумесныя прагулкі на свежым паветры будуць карыснымі для вас абаіх.
- Карысныя павольныя шпацыры на свежым паветры, гімнастыка раніцай, абціранне і абліванні, плаванне — усё, што засцеражэ вас ад сядзячага ладу жыцця і што вам па сілах.
- Неабходныя паўнавартасны сон і добры адпачынак.
- Маючы вялізны жыццёвы вопыт, вы пастаянна азіраецеся назад, і, звяртаючыся да сваіх успамінаў, прымаеце рашэнні, грунтуючыся менавіта на гэтым вопыце. Але варта навучыцца жыць днём сённяшнім, не азіраючыся назад. Цалкам аднолькавых сітуацый не бывае. Прымаючы рашэнне, варта ўсведамляць, што вы знаходзіцеся тут і цяпер і сённяшні час адрозніваецца ад вашага мінулага. Безумоўна, вопыт ранейшых памылак важны, але фактары, якія ўплываюць на прыняцце рашэння, могуць значна адрозніваць ад тых, што былі ў вашым мінулым вопыце.

Пастарайцеся планаваць сваю будучыню, і не трэба баяцца перамен — услед за імі ваша жыццё напоўніцца новым сэнсам, а паставіўшы перад сабой мэту і імкнучыся да яе, вы не пакінеце ў сваім жыцці месца для дэпрэсіі. Але ваш пасыл у будучыню павінен быць толькі пазітыўным і несці аптымізм, а не смутак.

І самае галоўнае — не бойцеся радавацца жыццю і атрымліваць ад яго асалоду, не хавайце сваіх пачуццяў і эмоцый. Пенсія — гэта не прыгавор. А вашы гады — ваша багацце.

Плюсы і мінусы

# ЦІ ТАКОЕ КАРЫСНАЕ ВЕГЕТАРЫЯНСТВА?

## Якія небяспекі тоіць абмежаванне ў ежы

**На працягу двух апошніх дзесяцігоддзяў у нас распаўсюдзіліся розныя харчовыя прыхільнасці, сярод якіх пераважае вегетарыянства. Як строгае, якое не дапускае ніякіх відаў жывёльнага бялку, — веганства, так і тое, што дапускае ўжыванне некаторых прадуктаў жывёльнага паходжання — такіх як яйкі, малако ці рыба. Радыкальныя формы вегетарыянства заклікаюць да сыраядзення (толькі раслінная і неапрацаваная ежа), «фруктарыянства» (толькі сырыя фрукты) і інш.**

Ідэя ўтрымлівацца ад жывёльнай ежы прыйшла да нас і з Захаду — разам з культам падцягнутага цела, модай сачыць за сабой і здароўем, і з Усходу, дзе вегетарыянства звязана з рэлігійна-духоўнай традыцыяй. Ва ўсім свеце, дарэчы, вегетарыянства прытрымліваецца каля 15 % насельніцтва. І прычыны, чаму людзі вырашаюць выконваць правілы гэтага кірунку, могуць быць як дыетычныя (паправіць здароўе ці лепш выглядаць), так і духоўныя (падчас прытрымлівання розных практык і культаў) ці этычныя (напрыклад, не прыносіць болю жывым істотам). Так ці іначай, такі спосаб харчавання не можа не ўплываць на наш арганізм.

— Несумненна, пэўныя плюсы ў вегетарыянства ёсць, і заключаюцца яны ў тым, што ў раслінай ежы — агародніне, фруктах і збожжавых — змяшчаецца шмат вітамінаў, мінералаў, фітанцыдаў, клятчаткі. Лёгкасць ператраўлівання большасці прадуктаў станоўча ўплывае на нашу стрававальную сістэму, — расказвае **ўрач-гігіеніст Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вольга ФІНСКАЯ.** — Разам з тым у вегетарыянстве існуюць і негатыўныя моманты.

- Найперш, гэта незбалансаванасць па асноўных пажыўных рэчывах. У рацыёне пераважаюць вугляводы, зусім мала бялку і тлушчаў, якія неабходны арганізму.
- Раслінны бялок засвойваецца горш, чым жывёльны, і не змяшчае ўсіх патрэбных нам амінакіслот, якія ў норме мы атрымліваем з мяса. А бялок, між іншым, — гэта будаўнічы матэрыял для клетак і тканак, без яго не могуць выпрацоўвацца гармоны і ферменты.
- Вегетарыянства тоіць небяспеку развіцця жалезадэфіцытнай анеміі, бо жалеза, якое змяшчаецца ў раслінай ежы, не так добра засвойваецца.
- Адсутнасць вітамінаў $B_{12}$ і $B_2$ можа прывесці да развіцця захворванняў нервовай сістэмы, дэпрэсіі і трывогі.
- У выніку недахопу вітаміну Д у дзяцей развіваецца рахіт, а ў дарослых — астэапароз, разбураецца косная тканка зубоў.
- Назіраецца дэфіцыт такіх мікраэлементаў, як кальцый, ёд, цынк.

***Таму, прымаючы рашэнне стаць вегетарыянцам, варта памятаць і пра негатыўныя наступствы такога выбару. Магчыма, вам давядзецца дадаткова прымаць карысныя рэчывы, якіх не хапае, у якасці харчовых дабавак і кансультавацца са спецыялістам аб дапушчальнасці такога харчавання ў адпаведнасці са станам вашага здароўя.***

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

Рэпартаж

# Цана нашага спакою

## Карэспандэнт «Звязды» пазнаёмілася з заўсёднікамі «пажыўных месцаў» сталіцы

**З Цэнтральнага РУУС Мінска мне патэлефанавалі ў апошні рабочы дзень тыдня і запрасілі ў рэйд. Увечары таго ж дня. На тым канцы проваду растлумачылі — звычайная работа міліцыі. Рэйд праводзіцца супрацоўнікамі аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Цэнтральнага РУУС Мінска сумесна з АМАП Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама. Адпрацоўваюцца кватэры з рэпутацыяй «прытон». Яны стаяць на ўліку ў РУУС. На жыхароў і гасцей адпаведных кватэр часта выклікаюць міліцыю суседзі з-за п'янак і лаянак. Такія месцы ёсць ва ўсіх раёнах горада, наш маршрут праходзіў па Цэнтральным, дарэчы, не самым крымінагенным раёне сталіцы.**

### Залежныя, але не абавязаныя

Выязджаем а пятай гадзіне вечара на службовым аўтамабілі АМАП. Са мной разам участковы **інспектар міліцыі Цэнтральнага РУУС Мінска, старшы лейтэнант Вячаслаў КРЫВАШЭІН** і **часова выконваючы абавязкі старшага інспектара ўпраўлення правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама маёр Сяргей МЯДЗЮХА.** Таксама нас суправаджаюць некалькі байцоў АМАПа.

У першай кватэры па вуліцы Арлоўскай, якую мы наведваем, нікога дома няма. Суседзі расказваюць, што там жывуць дзве жанчыны. У дакументах міліцыянераў кватэра пазначана як прытон, але дзверы выглядаюць прыстойна, таму я выказваю сумненне. Стражы правапарадку паціскаюць плячыма і тэлефануюць у аддзел: магчыма, кватэру можна зняць з назірання? Так робяць, калі на жыхароў на працягу некалькіх месяцаў няма скаргаў ад суседзяў. Але цуду не здараецца. Дзяўчаты, што там жывуць, любяць «пагудзець», з-за іх па-ранейшаму часта выклікаюць міліцыю.

— Давайце пройдземся на іншы адрас пешшу, — прапануе старшы лейтэнант Крывашэін.

Усе згодныя. Ідзём. Дзьме вецер, і ў твар балюча ўпіваецца ледзяная крышанка. Уцягваем шыі ў каўняры. Усе, акрамя супрацоўнікаў АМАПа. Яны энергічна, шырокім крокам ідуць ва ўказаным напрамку. Наша мэта — прытон наркаманаў. Па інфармацыі, якой валодае міліцыя, там пражывалі брат з сястрой — дарослыя дзеці гаспадыні, зараз жыве толькі сястра, брат пазбаўлены волі. Маці з'ехала ў Кіеў, а кватэра ператварылася ў прытулак для залежных і судзімых.

— Адкрывайце, міліцыя! — гучна крычыць амапавец.

Па той бок дзвярэй разрываецца ад брэху сабака. Адкрывае высокая хударлявая жанчына, непрычасаная і заспаная.

— Вітаю, а што здарылася? — заклапочана пытаецца яна.

— Забярыце сабаку, праверка, — тлумачыць міліцыя.

Пераступаю парог кватэры і адчуваю пах тытунёвага дыму, заляжалых недакуркаў, перагару, смецця і бруду.

— Чуеце пах? — пытаецца ў мяне маёр Сяргей Мядзюха. — Гэта смурод прытона. Вы яго яшчэ сёння не аднойчы пачуеце.

Мы ходзім па кватэры. Ступаю няўпэўнена. Мае спадарожнікі былі тут неаднойчы, яны адразу правяраюць шафы, санвузлы, пакоі. У кватэры ёсць яшчэ мужчына. Ён у кастрычніку вызваліўся з турмы. Жанчына расказвае, што больш не «абавязаная». «Абавязанымі» лічацца асобы, у адносінах да якіх уступіла ў законную сілу рашэнне суда аб спагнанні расходаў, панесеных дзяржавай на ўтрыманне іх дзяцей, якія знаходзяцца ці знаходзіліся на дзяржаўным забеспячэнні. У жанчыны, якая нам адкрыла, дзве дачкі 6 і 10 гадоў. Адну яна адвезла маці ў Кіеў, а другую — бацьку, былому мужу. Міліцыя адразу правярае яе расказ. Сапраўды, яна дзяржаве больш не павінна... Яе просяць паказаць рукі. Яна нервуецца. Сцвярджае, што больш «не колецца». Але на ўнутраным баку правай рукі сіняя пляма.

— Гэта проста шрам, — тлумачыць жанчына.

Ёй не вераць. Але ўсё роўна сыходзім — нічога не знайшлі. У госця ёсць дакументы.

— У кватэры, якія стаяць на ўліку як прытон, мы прыязджаем да двух разоў у месяц,— расказвае лейтэнант міліцыі па дарозе на новы адрас. — Гэта неабходна, каб жыхары разумелі, што іх могуць праверыць у любы момант. Яны тады стараюцца сябе паводзіць спакойней, менш дэбашыраць. Канешне, бывае, што два разы на месяц мала. І калі на адрас праблемных суседзяў часта выклікаюць міліцыю, то і наведваем часцей. У прытонах збіраюцца не толькі залежныя ад алкаголю і наркотыкаў людзі, але і судзімыя, і нават тыя, што знаходзяцца ў вышуку за розныя правапарушэнні.

У наступнай кватэры таксама ціха. Няма кампаніі, толькі Слава, які таксама нядаўна вызваліўся з турмы. Калі ён выпівае, яго выганяе жонка. З дакументамі ў мужчыны ўсё ў парадку, мы сыходзім.

### Аксана, яна ж Іна...

Рушым далей па вуліцы да дома, дзе, згодна з дакументамі, пражывае пажылая жанчына. У яе звычайна збіраецца «старая гвардыя» — залежныя, якім за 50 гадоў. Прыходзяць сябры пасля атрымання пенсіі. Амаль тыдзень у кватэры доўжыцца застолле, сваркі і бойкі...

Звонім у дамафон. Ніхто не адказвае. Кватэра знаходзіцца на першым паверсе, і мае спадарожнікі заўважаюць у вокнах сілуэт чалавека. Пад'езд адкрываюць суседзі. Дзверы патрэбнай нам кватэры адчыняе пажылы мужчына. Ён спакойны, расказвае, што гаспадыня памерла некалькі тыдняў таму, а ён сваяк новай гаспадыні: дамовіліся, што зробіць рамонт. Жыве адзін. Раману 61 год, ён не хавае прозвішча і ахвотна адказвае на пытанні міліцыянераў, пакуль супрацоўнікі АМАПа аглядаюць кватэру.

Раптам я чую гучны смех. «Выходзь давай! Чаго сядзіш, хутчэй!» — у адказ з шафы вылазіць... маладая жанчына. Яна спалохана ціснецца ў вугал калідора і ўся дрыжыць. Пытанні сыплюцца гарохам: адкуль? Навошта? Чаму? Год нараджэння? Рэгістрацыя? Работа?... Аксана адказвае дрыжачым голасам, ледзьве не плача.

Мне жанчына расказвае, што вельмі спужалася, калі сталі грукаць у вокны. Падумала, што па яе прыйшоў сужыцель, з якім яна пабілася. І што нічога лепей не прыдумала, як схавацца ў шафе. Расказала, што сама з Пінска. У Мінск прыехала шукаць работу, а дзіця пакінула на былога мужа. Прыйшла ў гэту кватэру да сяброўкі, якая хутка па яе прыйдзе. Яе аповед прыпыняюць пытанні. Зноў і зноў пра адно і тое ж. Мне становіцца шкада Аксану. Хочацца неяк ёй дапамагчы. Але... У Аксаны няма дакументаў. Праверыць яе словы на месцы немагчыма. Трэба ехаць у грамадскі пункт аховы правапарадку.

У «аўтазаку» допыт Аксаны працягваецца. Зноў і зноў ёй задаюць адны і тыя ж пытанні. Мне здаецца, што толькі старшы лейтэнант Крывашэін шкадуе жанчыну. Ён маўкліва назірае, а потым супакойвае

Аксана... А можа, Іна?

тым, што зараз усё праверыць і яе адпусцяць. Мне міліцыянер ціха тлумачыць, што здараецца, «такія людзі» выкарыстоўваюць чужое імя і прозвішча, каб пазбегнуць адказнасці за сваё правапарушэнне.

Я гляджу на жанчыну, якая адзінока і скурчана сядзіць на лаўцы аўтамабіля. З кожным пытаннем яна робіцца больш замкнёнай, стараецца адказваць коратка. «Каб не раздражняць тых, хто пытаецца», — думаю я.

Але ў «апорным пункце» нечакана высвятляецца, што жанчына паблытала свой год нараджэння, не можа назваць імя свайго былога мужа... Нарэшце яна згаджаецца напісаць сапраўднае імя ў нататніку, які ёй дае лейтэнант Крывашэін. Аксана аказваецца... Інай. Гэту інфармацыю адразу правяраюць. Я са здзіўленнем заўважаю, што жанчына больш не дрыжыць, трымаецца развязна, адказвае нахабна... Іна знаходзіцца ў вышуку Брэсцкім РАУС.

У гасцях у Камбата.

### А Камбат сапраўдны?

Мяне такія метамарфозы вельмі ўражваюць і расчароўваюць. Чамусьці вельмі захацелася дадому. Дзе чыста, цёпла і ўсё зразумела.

— Чаму рэйд у пятніцу? — пытаюся ў старшага інспектара.

— Гэта невыпадкова, — тлумачыць маёр Мядзюха. — Пасля нашага наведвання праблемных кватэр іх насельнікі некаторы час паводзяць сябе ціха і не турбуюць суседзяў. Людзям жа хочацца пасля работы адпачыць на выхадных. Вось зараз едзем у прыватны сектар да Камбата. Ён нам расказваў, што раней служыў у Афганістане, ці праўда гэта — не ведаю. Зараз яго частка дома лічыцца прытонам. Нядаўна яго госці пасварыліся паміж сабой, адзін другога ў п'янай бойцы моцна збіў. Выцягнулі чалавека ў непрытомным стане на вуліцу і кінулі. Уяўляеце сабе: прыватны сектар, а сярод вуліцы мужчына, заліты крывёю, ляжыць. Калі людзі выклікалі міліцыю, то віноўніка доўга шукаць не прыйшлося. Дом гэты ўжо даўно здабыў сабе нядобрую славу...

Уваходзіць у дом Камбата не проста непрыемна, а ўжо страшна. У сенцах са сцяны тырчаць іржавыя трубы, з іх капае вада. Здаецца, столь вось-вось абваліцца. І тыя самыя смурод, смецце, бруд... Першы мой імпульс — выйсці з небяспечнага месца і атрэсці сябе... Тапчуся ў сенцах — не хачу ісці далей. Чуюцца крыкі. Пераадольваю агіду і заходжу ў пакой. На старой канапе сядзіць Камбат — невялікі стары чалавек. Справа ад яго маладзейшы мужчына спрачаецца з міліцыянерамі, не хоча называць сваё прозвішча і лаецца... Пакойчык здаецца маленькім, магчыма ад тытунёвага дыму... Я не магу ўдыхнуць, не вытрымліваю і хутка сыходжу на вуліцу, далей за брамку...

Тут ціха. Гляджу на снег у святле ліхтара. Але і тут мяне наганяюць лаянка, мітусня — цягнуць госця Камбата ў «аўтазак». Падыходжу да лейтэнанта Крывашэіна, каб сказаць, што больш нікуды не паеду. Мяне прапануюць падвезці да прыпынку аўтобуса. Хвіліны ў «аўтазаку» падаюцца невыноснымі. Новы пасажыр няспынна спрачаецца і крычыць, Іна панура глядзіць у адну кропку...

Крочу дадому, і мне раптам становіцца радасна. Ад таго, што чакаюць муж і дзеці, і мы зараз разам будзем піць гарбату, а потым чытаць казкі і жадаць адно аднаму добрай ночы. Цяпер добра ведаю, што стаіць за сухім паведамленнем МУС: «Святы ў Беларусі прайшлі спакойна, грубых правапарушэнняў грамадскага парадку не было», і якім чынам дасягаюцца спакойныя выхадныя.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

***P.S.*** *Пасля мне паведамілі, што падчас рэйду былі затрыманыя 20 грамадзян і яшчэ праверaны 22 раней судзімыя асобы, якія стаяць на прафілактычным уліку ў міліцыі.*

## ЗАРАБЛЯЛІ ПА-ЧОРНАМУ

**Пракуратура Магілёўскай вобласці накіравала ў суд крымінальныя справы ў адносінах да двух магіляўчан, якія абвінавачваюцца ў незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці.**

Адзін з іх, па версіі следства, здзяйсняў незаконныя аперацыі з грашовымі сродкамі, займаўся падробкай дакументаў і аказваў садзейнічанне іншым фірмам ва ўхіленні ад выплат дзяржаве падаткаў, а другі — кіраўнік прыватнага прадпрыемства — сэканоміў на падатках буйную суму грошай.

— Следства ўстанавіла, што першы з абвінавачваных займаўся афармленнем фіктыўных таварасуправоджальных дакументаў, выкарыстоўваючы рэквізіты і разліковыя рахункі трох падкантрольных яму прыватных структур, зарэгістраваных на тэрыторыі Гомельскай вобласці, — растлумачыла **старшы пракурор аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці Марына ЦІТОВА.** — За свае паслугі ён атрымліваў працэнты ад здзелак. А яго кліенты, каб легалізаваць набытыя за наяўны разлік тавары, змяшчалі ў бухгалтарскія дакументы хлуслівыя звесткі для заніжэння падатковай базы.

Аналіз разліковых рахункаў прыватных прадпрыемстваў дазволіў устанавіць усе суб'екты гаспадарання, кіраўнікі якіх ухіляліся ад выплаты падаткаў у буйным і асабліва буйным памерах, а таксама асоб, якія займаліся незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю. У дачыненні да васьмі чалавек судамі Магілёўскай вобласці разгледжаны крымінальныя справы.

Нанесеная дзяржаве шкода ў выніку злачыннай дзейнасці абвінавачваных склала 1 541 600 рублёў. У ходзе следства абвінавачванымі і асуджанымі раней асобамі было кампенсавана 1 098 737 рублёў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ПАПАЛІСЯ НА ХАБАРЫ

**Галоўным упраўленнем па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй Міністэрства ўнутраных спраў у Мінску затрыманы службовыя асобы ААТ «Беларускалій».**

Як паведамілі ў МУС, у хабарніцтве падазраюцца начальнік аддзела кіравання інвестыцыямі і суправаджэння будаўніцтва, а таксама намеснік генеральнага дырэктара па будаўніцтве. Апошні затрыманы з доказамі злачынства пры атрыманні ад кіраўніка адной з камерцыйных структур грашовай сумы ў памеры 10 тысяч долараў ЗША за вырашэнне пытанняў, якія ўваходзілі ў яго кампетэнцыю.

У адносінах да вышэйназваных службовых асоб распачаты крымінальныя справы па ч. 2 арт. 430 КК Рэспублікі Беларусь. У адносінах да хабарадавальніка заведзена крымінальная справа па ч. 2 арт. 431 КК. Зараз усе ўдзельнікі карупцыйнай «здзелкі» заключаны пад варту.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

Карысны досвед

# АДВЯЗІЦЕ ПРЫГАЖУНЮ... У ЗААПАРК

## Як правільна (а галоўнае — экалагічна!) утылізаваць навагодняе дрэва

**Знакамітая песня «Елачка» заканчваецца словамі пра пацеху і радасць, якую хвоя прыносіць людзям у святочныя дні. Пра тое, што адбываецца з елкай пасля, гаварыць не прынята. Тым не менш з сярэдзіны студзеня сумную карціну можна ўбачыць у кожным двары краіны. Сіратлівымі, высахлымі ялінкамі забітыя практычна ўсе сметнікі.**

Раней вастрыня праблемы не адчувалася, бо ў дамах былі печкі. Адгулялі святы, і — «раз, два, тры — ялінка, гары! (у прамым сэнсе)!» Дрэўца прыемна патрэсквае і дае цяпло. Цяпер нават у многія вёскі правялі прыродны газ. Неабходнасць у дрэве як энерганосьбіце адпала. Затое з'явіліся «елачныя могілкі».

Як высветлілася, тэма правільнай утылізацыі жывых елак хвалюе многіх беларусаў. Ва ўсякім разе, у Цэнтр экалагічных рашэнняў у студзені звяртаюцца часцей за ўсё менавіта з гэтым пытаннем.

— У Мінску навагодняе дрэва можна прыбраць трыма спосабамі. Першы варыянт патрабуе часу і пэўных намаганняў, але ён самы правільны з пункту гледжання экалагічнасці. Елку трэба акуратна распіліць, падсушыць і вывезці на лецішча або ў лес, каб выкарыстаць у якасці дроў. Хвоя і дом можа абагрэць, і добрыя вуглі для прыгатавання шашлыкоў з яе атрымаюцца. Другі варыянт усім вядомы: пакінуць дрэва на спецыяльнай пляцоўцы для буйнагабарытнага смецця ў двары. Адтуль ялінку вывезуць на палігон. І хоць дрэва адносіцца да арганічных адходаў і па ідэі павінна даволі хутка згніць, пад слаямі з іншага смецця працэс зойме значна больш часу, чым у натуральным асяроддзі. Зусім неэкалагічна. Апошні варыянт — адвезці елку ў заапарк. Адны жывёлы не адмовяцца паласавацца хвояй, іншыя будуць радыя «пагуляць» з сухім дрэвам ці пачасаць аб яго спінку, — расказала **Дар'я ЧУМАКОВА, кіраўнік праграмы па экалагічна прыязным ладзе жыцця цэнтра.**

Жыхары вёсак і невялікіх гарадоў, побач з якімі ёсць фермы, могуць зазірнуць са сваімі елкамі туды. Але папярэдне абавязкова звяжыцеся з загадчыкамі агракомплексаў і пацікаўцеся, ці патрэбна хвоя для іх скацінкі. Карысць такой дабаўкі ў рацыён жывёлы даўно даказана навукоўцамі. Праўда, аддаючы елку на корм, уважліва ачысціце яе ад мішуры і «дожджыку».

Калі магчымасці вывезці сваю «калючку» няма, можна пусціць яе ў ход, не пакідаючы кватэры. Прыхільнікі народнай медыцыны ведаюць, што хвоя — крыніца вітаміну С. Ён у нашых шыротах зімой асабліва неабходны. Паспрабуйце прыгатаваць хвойны настой для падтрымкі імунітэту. Запарце некалькі галінак разам з іголкамі кіпнем, няхай настаяцца. А пасля дадайце крыху мёду. Лясныя лекі гатовыя! Дарэчы, такім настоем (толькі без мёду) можна і пакаёвыя кветкі падкормліваць.

Заўзятым садаводам і ландшафтным дызайнерам таксама не раім спяшацца выкідваць навагодняе дрэва. Калі перапрацаваць яго ў дранку, то можна атрымаць ідэальны матэрыял для мульчыравання. Дранкай прысыпаюць зямлю вакол раслін, яна захоўвае вільгаць у глебе і не дае распаўсюджвацца пустазеллю.

### А ЯК У ІНШЫХ

У Еўропе, дзе газ, вугаль і тым больш дрэва каштуюць неймаверна дорага, карыснымі рэсурсамі раскідвацца не прывыклі. У Фінляндыі кожны дзясяты дом у студзені і лютым атрымлівае цяпло і гарачую ваду дзякуючы святочным дрэвам. Немцы ў адным толькі Берліне адпраўляюць на перапрацоўку не менш за 400 тысяч елак пасля свят. Усе яны ідуць на ацяпленне гарадскіх кватэр і грамадскіх устаноў. Шведы пайшлі яшчэ далей: ствалы адпраўляюць на фабрыкі мэблі, галінкі з іголкамі — на корм жывёлам. Акрамя таго, тут з хвоі робяць касметыку. Вынаходлівыя канадцы на аснове хвойных экстрактаў з навагодніх дрэў ствараюць лекі ад грыпу.

Нашы найбліжэйшыя суседзі таксама ад сусветных трэндаў не адстаюць. У Расіі пакуль зборы зялёных прыгажунь праходзяць пад лозунгамі накшталт «Сустрэў прыгожа Новы год — вярні елку ў абарот». Валанцёры і мясцовыя ўлады прыстройваюць цэлыя елкі ў заапаркі, перапрацаваныя на дранку ідуць на патрэбы паркаў, сквераў і садоў. Ва Украіне «Кіеўзялёнбуд» заклікае гараджан да экалагічнай свядомасці ўжо чацвёрты год запар. Ва ўсіх раёнах украінскай сталіцы працуюць пункты прыёму навагодніх дрэў. Прычым з кожным сезонам акцыя становіцца больш папулярнай сярод людзей. За мінулыя студзень — люты ўдалося сабраць больш за дзесяць тысяч елак, якія вясной пайшлі на мульчыраванне гарадскіх дрэў і кветак.

Цікава, што падобныя акцыі некалькі разоў пачыналіся і ў беларускіх гарадах, але, не займеўшы належнай падтрымкі сярод жыхароў, згасалі.

— Ёсць надзея, што ў найбліжэйшыя гады камунальныя службы, зялёнбуды і лясгасы ўсё ж падключацца да праблемы. Гэтыя арганізацыі маюць тэхніку, якая перапрацоўвае дрэвы на дранку. Елкі, сосны, туі — цудоўны кампост, нашто тады выкідваць іх на сметнікі? — разважае Дар'я Чумакова. — Вядома, многае залежыць ад саміх людзей і іх жадання зберагчы прыроду. Экалагічныя звычкі выпрацоўваюцца гадамі. Ялінку, з якой сыплюцца іголкі, прасцей данесці да сметніка, чым давезці да пункта прыёму ці ў заапарк. Таму важна працаваць у першую чаргу з сумленнем людзей, пашыраць іх веды ў тэме экалогіі.

**Ганна КУРАК, фота аўтара.**

На дарогах

# СОЛЬ ЗІМЫ

## Якімі рэагентамі пасыпаюць нашы вуліцы і да чаго гэта можа прывесці

**Сярэдзіна студзеня, а новыя скураныя боты выглядаюць так, быццам вы ў іх прайшлі тысячу кіламетраў па ўзбочыне шашы? Сітуацыя знаёмая кожнаму гараджаніну ў наш час. Чым так шчодра апрацоўваюць дарогі і як ад гэтага абараніць свой абутак, расказаў хімік, старшы выкладчык кафедры аналітычнай хіміі хімфака БДУ Віталь КОНДРАЎ.**

— Карыстацца антыгалалёднымі сумесямі пачалі ў Савецкім Саюзе яшчэ ў далёкія 50—60-я гады. Прыйшла гэтая практыка да нас са скандынаўскіх краін, дзе зімы хоць і мяккія, але даволі працяглыя. У сярэдзіне XX стагоддзя ў Маскве, Кіеве, Мінску асфальт пасыпалі ва ўмераных колькасцях хларыдам натрыю — звычайнай кухоннай соллю (яе яшчэ называюць галітам) ці пясчана-салянымі сумесямі. Тады як у паўночных рэгіёнах, дзе тэмпература паветра ў некалькі разоў ніжэйшая і пастаянна лютуе мароз, прыходзілася выкарыстоўваць гэтыя ж рэагенты ў вялікіх колькасцях або «атакаваць» лёд хларыдам кальцыю. Ён даражэйшы, але больш эфектыўны пры нізкіх тэмпературах. А пясчана-саляная сумесь у вадзе замярзае ўсяго пры мінус 2—6 градусах, — пачынае з гістарычнага экскурсу навуковец.

Сёння ў Беларусі няма адзінай схемы барацьбы са «снежна-лёдавай» праблемай на дарогах. Кожная арганізацыя закупае рэагенты, адштурхоўваючыся ад сваіх фінансавых магчымасцяў.

Дарожныя і камунальныя службы збольшага працягваюць выкарыстоўваць «пясок-соль». Танней за ўсё, і «лепш нічога не прыдумалі».

Так, на першага студзеня на апрацоўку сталічных двароў супрацоўнікі ЖКГ патрацілі крыху больш за тысячу тон пясчана-салянай сумесі.

— За дзень ідзе прыблізна 40—50 тон. Лічба вялікая, аднак суаднесенасць складнікаў сумесі залежыць ад надвор'я. Аптымальная канцэнтрацыя солі — каля 30 працэнтаў. Гэтага дастаткова, каб знізіць слізганне на тратуарах і дарожках унутры двароў, — расказала **Юлія СІДАРОВІЧ, вядучы інжынер аддзела добраўпарадкавання Мінскай гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

Аднак, на думку Віталя Кондрава, галіт не самы лепшы варыянт для нашых дарог.

— Калі тэмпература паветра вар'іруецца ад плюс да мінус пяці, як у гэтым снежні, — можна смела апрацоўваць дарогі соллю. Але студзень — люты звычайна прыносяць нам нечаканыя начныя маразы. Уявім сітуацыю: днём мы пасыпалі пясчана-саляную сумесь, яна пераўтварыла снег і лёд у вадкасць, якая сцякла з дарог і ў тым ліку трапіла ў асфальт — праз мікрашчыліны і дзірачкі. А ў ноч ударылі 10—15-градусныя маразы. Успамінаем школьны курс хіміі. Вада пры замярзанні расшыраецца ў аб'ёмах амаль на 10 працэнтаў. А разам з ёй «раз'язджаецца» дарожнае пакрыццё. З-за гэтага мы і маем вясной сумную карціну: разам са снегам і соллю сыходзіць асфальт. Таму лепш браць сумесі з хларыдам кальцыю. Перапады тэмператур ім не страшныя. Іншы варыянт — насычаць пясчана-саляную сумесь ізапрапілавым спіртам. Ён пры змяшэнні з вадой паніжае яе тэмпературу замярзання да мінус 40 (напрыклад, калі гарэлку ў маразілку паставіць, нічога з ёй не адбудзецца), — тлумачыць хімік. — Нельга забываць і пра экалогію. Соль «топіць» снег, пасля гэты раствор сцякае ў гарадскія калектары ці сыходзіць у глебавы слой, які знаходзіцца побач з асфальтам. Хларыд натрыю на нашых дарогах — гэта адходы вытворчасці кухоннай солі. Па сутнасці, самой солі там 90—95 працэнтаў, астатняе — цяжкія металы, сульфаты і іншае. Яны актыўна звязваюцца з гуміновымі кіслотамі — асноўным кампанентам глебы — і затрымліваюцца на паверхні. Пасля трапляюць у расліны і літаральна знішчаюць іх. Вядома, гэта можа адбыцца не пасля разавай апрацоўкі дарогі. Камунальныя і дарожныя службы сапраўды не перавышаюць нормы, але акумулятыўны эфект ніхто не адмяняў.

Зразумела, што зусім ад хіміі на дарогах адмовіцца немагчыма. Але мінімізаваць яе аб'ёмы — рэальна.

— Калегі з Маскоўскага дзяржуніверсітэта расказвалі, што ў іх ужо некалькі гадоў пасыпаюць тратуары гранітнай крошкай. Дробныя крупінкі ўпіваюцца ў снег і лёд, тым самым робяць паверхню шурпатай. Ніякай салёнай слоты пад нагамі — а значыць, абутак застанецца цэлым і жывёлы змогуць без боязі хадзіць па вуліцах. Калі ж снег пачне сыходзіць, гранітная крошка проста асядзе на асфальт і плітку. Яе можна змесці, а пасля паўторна выкарыстаць наступнай зімой. Вось вам і эканамічная эфектыўнасць. Тым больш што ў Беларусі ёсць сваё прадпрыемства па здабычы граніту. Экалагічнасць гэтага спосабу пацвярджаюць навукоўцы. Кусты побач з тратуарамі, пасыпанамі гранітнай крошкай, здаравейшыя за тыя, што церпяць ад «саляных паліванняў».

Абутак з натуральнай гладкай скуры псуецца ад галіту яшчэ хутчэй за дрэвы.

— Скура мае поры. Менавіта ў іх трапляе саляны раствор, які пры высыханні праяўляецца белымі плямамі. Каб гэтага не дапусціць, неабходна перад кожным выхадам на вуліцу апрацоўваць боты воданепрымальнымі сродкамі. Такія крэмы, як правіла, змяшчаюць высокамалекулярныя прадукты перапрацоўкі нафты. Разам з тым адным «памазаннем» не абысціся. Вяртаючыся дадому, абавязкова праходзьцеся па ботах вільготнай анучкай. А вось ад абутку з нубуку ці замшы зімой лепш увогуле адмовіцца, — раіць Віталь Кондраў. — Гэтыя матэрыялы ад солі абараніць даволі цяжка. Белыя разводы на іх непазбежныя. Пакутуюць зімой ад солі і сабачкі. Для іх гаспадароў выйсце адно — маленькіх гадаванцаў выносіць на прагулку ў парк на руках, вялікіх «абуваць», як сябе.

Некаторыя любяць прыгадаць даўнія часы, калі абутак служыў не адзін сезон, а 5—10 гадоў. І ў такім выпадку задаюцца пытаннем: а можа, на дарогі не толькі соль сыплюць, раз яна так раз'ядае нават натуральную скуру? Хімік гэтыя сумненні развейвае:

— Па-першае, старэйшае пакаленне са свайго абутку пылінкі здувала і ніколі не грэбавала элементарнымі правіламі догляду. Людзі раней больш цанілі рэчы. Па-другое, успомніце, якой тады была скура. Жорсткая, цвёрдая. Сёння ні адна дзяўчына на такі абутак нават не глянула б — гэта ж быў амаль аналаг керзавых ботаў. Сучасным модніцам падавай вытанчаныя боцікі з мяккіх матэрыялаў, а яны, на жаль, трываласцю не вылучаюцца.

**Ганна КУРАК.**

Спытайце пра радзіннае

# КАЛІ ВЫКІДВАЦЬ ЁЛКУ?

**«Традыцыйна святкуем Новы год і Каляды з упрыгожанай жывой ёлкай. А калі трэба выносіць навагоднюю прыгажуню з хаты?» — пытаецца Ангеліна Н. з Асіповіч.**

Нароўні з іншымі атрыбутамі традыцыйных абрадавых практык — адзеннем, рознымі сімвалічнымі рэчамі, стравамі, магічным словам або песняй, расліны і дрэвы, якія былі ўключаны ў кантэкст абрадаў, утваралі своеасаблівую «хатнюю карту гаспадыні», каляндарны год якой час ад часу месціўся ў покуце. Тут былі галінкі вярбы, асвечаныя ў Вербніцу, галінкі клёна і бярозы, якімі ўпрыгожвалі хату на Сёмуху, святаянскія палявыя кветкі і травы, сабраныя на Купалле, яблыкі, арэхі, мак далучаліся да гэтага шэрагу пасля Спаса, плады і галінкі каліны, рабіны — на Раство і Успенне Багародзіцы і інш.

У структуры беларускага традыцыйнага календара пачатак Новага года звязаны з святкаваннем Калядаў. Сімволіка гэтага свята адначасова мела два пачаткі: провады старога і сустрэчу новага каляндарнага года. Адным з асноватворных знакаў святкавання касмічнага вяртання «на кругі свае» і прыроднага адлюстравання гэтай бясконцай цыклічнасці, а таксама абрадавай фіксацыі «пераходу» з аднаго стану ў іншы стала елка — вечназялёнае хвойнае дрэва.

У больш ранняй традыцыі славяне сустракалі новы год з прыходам доўгачаканага цяпла — вясной. І адным з галоўных атрыбутаў у абрадавых дзеяннях святкавання «провадаў зімы» і «сустрэчы вясны» таксама была елка. У Лельчыцкім раёне Гомельскай вобласці мы былі сведкамі дзвюх святочных падзей. 15 лютага ў вёсцы Новае Палессе святкавалі Грамніцы. Па старадаўняй традыцыі ў гэты дзень тут ладзяць Провады зімы. На скрыжаванні дзвюх вуліц жанчыны вадзілі карагоды, а затым пачалі ўпрыгожваць невялікую ёлачку. Яна перадавалася з рук у рукі, і кожная з удзельніц прымацоўвала да галінак свае стужкі і кветкі. Канчатковай мэтай святочнага шэсця жанчын стаў аброчны крыж, які знаходзіўся ў сярэдзіне вёскі на скрыжаваннях. Да яго і прывязалі абрадавае дрэўца.

У цэнтры падзей Гукання вясны, якія разгортваліся ў вёсцы Тонеж таго ж раёна, апынуліся два атрыбуты: пудзіла Зімы (зробленае з саломы і прыбранае ў адзенне жанчыны) і вяршаліна елкі. Дзяўчаты перадшлюбнага ўзросту ўпрыгожылі дрэўца рознакаляровымі папяровымі стужкамі, кветкамі і «печывам»: фігуркамі казы, каровы, мядзведзя, зайца і птушак. Пасля рытуальнага абходу вёскі ўдзельнікі шэсця накіраваліся за ваколіцу. На пагорку стаяў-узвышаўся шматвяковы дуб. «А цяпер, Андруша, лезь на дуба і прымацуй там нашу ёлачку, туды, бліжэй да сонейка, каб хутчэй вясна прыйшла, птушачкі прыляцелі і нам цёпла было!» — сказала адна з жанчын, і хлапчук пачынаў прымацоўваць абрадавае «дрэўца» да вяршаліны сакральнага дрэва. Побач з дубам развялі вогнішча, у якім пасля працяглага ваджэння карагодаў спалілі пудзіла зімы... Удзельнікі свята апавясцілі свет пра тое, што зіма саступіла месца чарговаму абнаўленню прыроды.

«Жыццё», або перыяд існавання таго ці іншага атрыбута, заўсёды вызначалася рэгламентам абрадавай практыкі: напрыклад, галінкі вярбы будуць спалены ў суботу напярэдадні чарговай Вербніцы. Тое ж самае датычылася і навагодняй ёлкі. Пачатак пераходу на новы гадавы цыкл адбываецца ўвечары з 24 на 25 снежня (менавіта ў гэту ноч у прыродзе адбываецца паварот сонца на новы жыццёвы круг), таму і ёлку лепш за ўсё прынесці ў хату ўвечары 24 снежня, а вынесці яе з хаты варта пасля завяршэння Калядаў (у залежнасці ад таго, да якой хрысціянскай канфесіі вы сябе адносіце). Нагадаем, беларусы-каталікі святкуюць Каляды з 24 снежня па 5—6 студзеня, праваслаўныя беларусы з 6 да 20—21 студзеня), абавязкова да заходу сонца, каб усю тую адмоўную энергію, якую яна «ўвабрала» ў сябе за гэты двухтыднёвы пераходны час, не «перанесці» ў новы год зямнога існавання.

Дарэчы, паўсюдна было прынята невялікія галінкі елкі, якія збіралі пасля Вадохрышча ў храме або каля палонкі, несці дамоў. Лічылася, калі пакласці такую галінку ў покут або пад дах, хата і іншыя гаспадарчыя пабудовы абыдзе ўраган і навальніца: «Каб хлеў віхурай не знесла».

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

**Дасылайце свае пытанні аб каранях і прыстасаванасці да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».**

# ВЕКАВЫ ЮБІЛЕЙ

## ВІЦЕБСКАМУ АБЛАСНОМУ КРАЯЗНАЎЧАМУ МУЗЕЮ СПОЎНІЛАСЯ 100 ГАДОЎ

**Цікава, што падставай для яго стварэння стала перадача дзяржаве калекцыі яе збіральнікам Антонам Рафаілавічам Брадоўскім. Бадай, унікальны выпадак у гісторыі музейнай справы рэспублікі.**

### МЕДАЛІ, МІНЕРАЛЫ, ВЕЕРЫ...

Антон Рафаілавіч нарадзіўся ў беднай мяшчанскай сям'і ў Новааляксандраўску (зараз — Зарасай, Літва). Ён самастойна вывучаў розныя дысцыпліны: геалогію, геадэзію, мінералогію, біялогію, палеанталогію, касмаграфію, архітэктуру, фартыфікацыю, археалогію, нумізматыку, геральдыку.

У 1893 годзе ў якасці будаўнічага тэхніка і чарцёжніка Брадоўскі быў пераведзены ў Вільню, у Акруговае ваенна-інжынернае ўпраўленне. Прафесійная дзейнасць і, верагодна, шырокае кола знаёмстваў, спрыялі папаўненню збору. Іх калекцыянер размясціў у двух пакоях сваёй кватэры. Прыватны збор атрымаў назву «Музей старажытнасцяў і мастацкай прамысловасці».

У 1915 годзе разам з супрацоўнікамі інжынернага ўпраўлення Брадоўскі эвакуіраваўся ў Віцебск. Узяў, канешне ж, і свой збор.

У складзенай у 1920 годзе справаздачы аб рабоце музея Брадоўскі прыводзіць пералік 40 калекцый: тут курганныя артэфакты, мінералы, вееры, званочкі, гадзіннікі, курыльныя трубкі, зброя, карціны...

Самай шматлікай і каштоўнай была калекцыя нумізматыкі: манеты Старажытнай Грэцыі, Рыма, Усходу, Расіі, Польшчы і іншых краін. А таксама медалі, ордэны ды іншыя знакі адрознення.

### ДЫК КОЛЬКІ ГАДОЎ МУЗЕЮ?

Дарэчы, у некаторых СМІ з'явілася інфармацыя, што па сутнасці правільна было б святкаваць 150-ю гадавіну. У музейнай установе растлумачылі, што 150 гадоў таму прынялі рашэнне стварыць музей пры Віцебскім губернскім статыстычным камітэце. Але ж калекцыя захоўвалася ў кардоннай каробцы ў грашовым сейфе. Не гаворачы пра тое, што музейнага будынка, супрацоўнікаў тады не было.

Як растлумачыў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Валерый ШЫШАНАЎ,** афіцыйна ў наш час абласны музей, а ў 1918 годзе Віцебскі губернскі, заснаваны 12 лістапада 1918 года.

— Губернскі аддзел народнай адукацыі даў згоду на прыняцце калекцыі Антона Брадоўскага і выдаў загад № 3407 аб стварэнні на яе аснове губернскага музея і прызначэнні загадчыкам самога калекцыянера. Музей быў адкрыты для наведвання ў маі 1919 года ў адным з памяшканняў былой духоўнай семінарыі, — расказаў суразмоўнік.

Рашэннем СНК БССР ад 4 лістапада 1924 года віцебскаму музею быў перададзены будынак гарадской ратушы, які музей займае да гэтага часу. У тым жа годзе музей атрымаў статус аддзялення Белдзяржмузея ў Віцебску. І адпаведна — дзяржаўнае фінансаванне з рэспубліканскага бюджэту. У склад увайшлі калекцыі былога музея Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, былога царкоўна-археалагічнага музея, прыватнага музея В. П. Федаровіча.

### ПЕРАДАВАЛІ ЭКСПАНАТЫ АРХЕОЛАГІ

У гады Вялікай Айчыннай вайны фонды былі эвакуіраваны ў Саратаў. Пасля вызвалення Віцебска, 4 верасня 1944 года СНК БССР зацвердзіў пастанову Віцебскага абласнога савета дэпутатаў аб узнаўленні дзейнасці Віцебскага дзяржаўнага гістарычнага музея.

— На працягу другой паловы 1950-х гадоў у стацыянарнай экспазіцыі Віцебскага абласнога краязнаўчага музея былі раздзелы: прыроды, дасавецкага перыяду, савецкага часу (1917—1945 гады), раздзел пасляваеннага сацыялістычнага будаўніцтва, — працягвае Валерый Шышанаў.

У 1960-м быў адкрыты мастацкі аддзел. За той жа час з'явіліся тры філіялы Віцебскага музея: былая турма СД у Віцебску, экспазіцыі, прысвечаныя падпольнай групе «Юныя мсціўцы» — у гарадскім пасёлку Обаль Шумілінскага раёна і генералу Л. М. Даватару — ва Уле Бешанковіцкага раёна.

У 1976 годзе пачаліся работы па падрыхтоўцы рэстаўрацыі галоўнага будынка музея, сімвала абласнога цэнтра — ратушы. У сувязі з гэтым доступ публікі да стацыянарнай экспазіцыі быў абмежаваны, а неўзабаве ўвогуле спынены. Асноўную ўвагу падчас правядзення рэстаўрацыйных работ, якія зацягнуліся на дзесяць гадоў, супрацоўнікі абласнога музея звярнулі на камплектаванне фондавага збору і стварэнне выставак.



Аддзел этнаграфіі.

Для папаўнення фондаў наладжваліся комплексныя экспедыцыі, падчас якіх былі сабраны прылады працы і побыту сялян, узоры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, матэрыялы па гісторыі партызанскага руху, калгаснага будаўніцтва, індустрыялізацыі.

Перадавалі ў фонды і знаходкі, зробленыя падчас археалагічных даследаванняў Верхняга і Ніжняга замкаў Віцебска.

У Віцебску раскопкі праводзіліся ў 1970—1980-я гады. У музей перадалі каштоўныя калекцыі керамікі, вырабаў з металу, косці, скуры, дрэва. У тым ліку падвескі, залаты пярсцёнак, выразаныя з косці абразок, крыж, шахматныя фігуркі і многае іншае, — удакладняе намеснік дырэктара.

### МАНЕТКА... ПУШКІНА!

У верасні 2016 года адбылося адкрыццё новага філіяла Віцебскага абласнога краязнаўчага музея — Музея гісторыі прыватнага калекцыянавання. Ён размясціўся ў гістарычным будынку канца XIX стагоддзя — былой электрастанцыі, якая вырабляла электрычнасць для першага ў Беларусі трамвая.

— Стварэнне новай экспазіцыі было абгрунтавана тым, што менавіта ў гэтым горадзе больш за сто гадоў таму працавала плеяда калекцыянераў, краязнаўцаў, навукоўцаў, чые прыватныя зборы ляглі ў аснову першых музеяў Віцебска. Новы музей з'яўляецца пераемнікам Музея прыватных калекцый, які быў створаны ў 1993 годзе на аснове прыватнага збору Івана Галькевіча.

Адна з прадстаўленых у экспазіцыі манет мае прыгожую легенду і таму з'яўляецца асабліва каштоўнай, хоць гэта звычайная медная манета — 2 капейкі 1811 года. Па легендзе, гэтая манета належала Аляксандру Сяргеевічу Пушкіну. Як жа яна трапіла ў калекцыю Галькевіча?

Пра гэта ва ўспамінах расказваў сам калекцыянер: «У бытнасць сваю ў Пскове Пушкін зайшоў да шаўца Тапаркова адрамантаваць абцас правага чаравіка. За працу ён заплаціў меднымі манетамі. Ведаючы Пушкіна, просты рускі чалавек асобна захаваў дарагія для яго манеты. Некалькі штук ён раздаў сваім сябрам на памяць пра Пушкіна, дзве манеты пакінуў свайму ўнуку Яўграфію Апанасавічу Тапаркову. Апошні адну з іх падарыў у 1915 годзе свайму начальніку, маладому інжынеру Рагоўскаму, які жыў у яго на кватэры.

Рагоўскі, прачытаўшы артыкул «Хатні музей» пра калекцыянера Галькевіча, апублікаваны ў часопісе «Огонек» у 1958 годзе, даслаў Івану Данілавічу гэтую манету з лістом, які скончыў наступнымі радкамі: «Захоўвайце гэтую манету, як захоўвалі яе Тапарковы каля ста гадоў, і 42 гады захоўваў яе я. Гэтая манета — дарагая рэліквія і памяць аб вялікім Пушкіне».

### І ЎНІКАЛЬНАЯ БЕРАСЦЯНАЯ ГРАМАТА

У фондах музея каля 217 тысяч адзінак захоўвання.

Экспануецца крыху больш за 20 тысяч. І звязана гэта з абмежаванасцю экспазіцыйных плошчаў, адсутнасцю пастаянных экспазіцый, якія раскрываюць напрыклад, губернскі, савецкі перыяд. Але многія з прадметаў можна выстаўляць толькі абмежаваны час, паколькі немагчыма забяспечыць іх захаванасць: гэта графіка, фатаграфіі, рукапісы і гэтак далей.

— Якія экспанаты самыя ўнікальныя? — цікаўлюся ў суразмоўніка.

— Складана адказаць на гэтае пытанне, паколькі ў фондах музея шмат унікальных прадметаў, і як казалі даўней «у сваім родзе». Гэта і калекцыі тканіны — прадметы сялянскага і мяшчанскага касцюма XIX стагоддзя; набойныя дошкі другой паловы XIX стагоддзя; унікальная нумізматычная калекцыя — у тым ліку 14 «яфімкаў з прыкметай» еўрапейскіх талераў з надчаканкамі Маскоўскага манетнага двара (1655 год), якіх усяго вядома крыху больш за 2000 экзэмпляраў.

Сярод іншага ў музеі захоўваюцца прадметы, звязаныя з многімі выдатнымі людзьмі XIX—XX стагоддзяў. Напрыклад, лісты Яна Баршчэўскага, архіў вядомага віцебскага гісторыка Аляксея Сапунова, калекцыя жывапісу XIX — пачатку XX стагоддзя.

Гонар музейных работнікаў — унікальны да гэтага часу для Беларусі прадмет — берасцяная грамата, якая знойдзена ў Віцебску ў 1959 годзе.

Установа культуры, пачынаючы з 1992 года, удзельнічае ў арганізацыі выставачнай праграмы ў межах Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». За апошнія гады найбольш значнымі былі выстаўкі з розных музеяў і прыватных калекцый: выстаўка ранніх работ Марка Шагала, твораў Сальвадора Далі і Пабла Пікаса і іншыя...

У музеі штогод бывае больш за 150 тысяч наведвальнікаў, праводзіцца больш за 100 выставак, каля 2000 экскурсій.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Жывая прырода

# САПРАЎДНЫЯ СУПЕРГЕРОІ



**Персанажы коміксаў, што апошнім часам сталі вельмі папулярныя, часцяком валодаюць неверагоднымі здольнасцямі, якія ў якасці прататыпаў выкарыстоўвалі ўменні рэальных жывёл нашай планеты. Наш від, чалавек разумны, і сам па сабе маху не дасць — сярод іншых жывёл мы выдзяляемся суперінтэлектам, але, гледзячы на надзвычайныя ўменні некаторых «братоў нашых меншых», застаецца толькі зайздросціць. Таму што прырода, эвалюцыя і ўмовы жыцця надзялілі іх сапраўднымі сілай і здольнасцямі супергерояў.**

**Сапсан — суперхуткасць.** Гэта самая хуткая птушка ў свеце. Паводле ацэнак спецыялістаў, пры атацы на здабычу ў імклівым пікіруючым палёце яна здольная развіваць хуткасць звыш 322 км/г, або 90 м/с. Быў зафіксаваны рэкорд у 390 км/г! Гэтыя птушкі настолькі паспяховыя паляўнічыя, што распаўсюджаныя на ўсіх кантынентах, акрамя Антарктыды.

**Гнаявік — суперсіла.** Мала таго, што гнаевікі валодаюць неверагоднай убудаванай сістэмай навігацыі, якая дазваляе ім знаходзіць дарогу, яны яшчэ і асілкі. Гнаевікі могуць перасоўваць вагу ў 1140 разоў большую за сваю ўласную. Яны штурхаюць прадметы, якія суадносяцца з іх уласнымі памерамі так, як бы чалавек штурхаў 100-тонны груз. Гэта сур'ёзная заяўка на тытул наймацнейшай жывёлы планеты. Набыў жук такую суперсілу у шлюбных баях за самак, калі забраўшыся ў тунэль да выбранніцы, ім даводзіцца выштурхоўваць нечаканага саперніка.

**Ціхаходка — няўразлівасць.** Мікраскапічныя беспазваночныя, «маленькія вадзяныя мядзведзі» — адны з самых цягавітых стварэнняў Зямлі, здольныя вытрымаць амаль любыя ўмовы існавання. Упадаючы ў своеасаблівы «спячы рэжым», яны перажываюць тэмпературы ад -272 да +150 °С, спакойна пераносяць дозы радыяцыі, якія ў 100 разоў перавышаюць лятальны парог для людзей, і могуць заставацца без ежы на працягу 30 гадоў.

**Аксалотль — рэгенерацыя.** Прасунутая рэгенерацыя, якая дазваляе аднаўляць канечнасці, не рэдкасць у свеце жывёл. Але лічынкі саламандры, аксалотль, адораныя, як ніхто іншы. Яны могуць адрошчваць новыя канечнасці і ўнутраныя органы ўсяго толькі за месяц, а таксама аднаўляць загінулыя ўчасткі мозга. Самае дзіўнае — калі ўзяць часткі цела аднаго аксалотля, яны цалкам могуць прыжыцца на іншым — нават вочы!

**Медуза Turritopsis — неўміручасць.** Многія медузы за сваё жыццё змяняюць дзве формы — плаваючую і паліпа. У асноўным трансфармацыя адбываецца толькі аднойчы, але не ў выпадку з медузамі роду Turritopsis. У выпадку фізічнага пашкоджання, хваробы ці старасці яны вяртаюцца ў форму паліпа, адкуль затым зноў выходзяць плаваючай медузай. Біялагічная неўміручасць натуральным чынам.

**Пеніца — суперскакун.** Пеніцы — сямейства цыкадавых раўнакрылых насякомых, і іх здольнасць да скачкоў пасароміць нават «дасягненні» блох. Пры даўжыні цела ў 2 міліметры пеніца можа скокнуць у вышыню на 70 сантыметраў, а ў даўжыню — да двух метраў. Калі ўзяць чалавека, то з такімі здольнасцямі ён мог бы скакаць на 170 метраў у даўжыню.

**Васьміног-імітатар — трансфармацыя.** Васьміногі самі па сабе выдатна ўмеюць злівацца з мясцовасцю, змяняючы колер, і пралазіць у маленечкія адтуліны, але Thaumoctopus mimicus пайшоў яшчэ далей. Ён пераймае вонкавы выгляд і паводзіны дзясятка марскіх насельнікаў — скатаў, камбал, медуз, крабаў, марскіх змей і інш. Імітатар мяняе знешні выгляд у залежнасці ад таго, які драпежнік ці здабыча набліжаецца да яго.

**Электрычны вугор — кіраванне электрычнасцю.** Нягледзячы на назву, электрычны вугор на самай справе не вугор, а рыба, роднасная самам. Па баках яго цела размешчаны электрычныя органы, якія генерыруюць разрад напружаннем да 1300 вольт, якія кіруюцца мозгам праз нервовыя валокны. Электрычныя вугры не баяцца нікога ў сваім асяроддзі і ўяўляюць пагрозу нават для чалавека.

**Качканосы — электрарэцэпцыя.** Здольнасць улоўліваць слабыя электрычныя палі, якія ўзнікаюць пры скарачэнні мускулаў ракападобных, надзвычай карысная, калі трэба паляваць пад вадой. Яна ёсць у шэрагу рыб і амфібій, але сярод жывёл толькі качканосы могуць пахваліцца дасканалым валоданнем электрарэцэпцыяй.

**Рак-багамол — суперзрок.** Ракі-багамолы валодаюць шэрагам здольнасцяў, якія можна класіфікаваць як «супер», але ў першую чаргу гаворка пойдзе аб зроку. Іх вочы экіпіраваныя 16 відамі фотарэцэптараў (у той час як у чалавека іх чатыры), яны могуць бачыць ва ультрафіялеце, а некаторыя віды — засякаць палярызаванае святло. Таксама ўдары іх клюшняў настолькі моцныя, што могуць разбіць шкло таўшчынёй больш за шэсць сантыметраў.

**Гекон — суперліпкасць.** Кіношныя супергероі могуць узбірацца па стромых хмарачосах. А вось гекон — невялікая яшчарка — здольная сапраўды трымацца на гладкай шкляной паверхні толькі пры дапамозе нават аднаго пальца. Яго лапкі пакрытыя тысячамі дробных валасінак, дакладней нават мікраваласінак, якія ўзаемадзейнічаюць з іншымі паверхнямі на малекулярным узроўні, забяспечваючы трывалае счапленне.



Тэхналогіі

## У Японіі робаты іграюць памерлых людзей

**У адным з эпізодаў брытанскага сацыяльна-сатырычнага серыяла «Чорнае Люстэрка» была расказана гісторыя пра тое, як маладая дзяўчына, перажываючы пра памерлага маладога чалавека, замовіла яго «копію», заснаваную на тэхналогіях штучнага інтэлекту. Раней ужо неаднаразова «Чорнае Люстэрка» станавілася прароцкім фільмам, і нешта падобнае адбылося і зараз: у Японіі прадстаўлены робаты, якія імітуюць голас і паводзіны чалавека, што пайшоў з жыцця. Гэтым робатам нават робяць маскі твараў памерлых людзей.**

Адразу варта заўважыць, што карыстацца такімі робатамі японцы могуць толькі 49 дзён. Такая колькасць дзён з'яўляецца перыядам жалобы пасля пахавання сваяка. І распрацоўшчыкі лічаць, што такім чынам чалавеку будзе прасцей перажыць страту. Пры гэтым аб стварэнні такога робата лепш падумаць загадзя. Чалавеку трэба сустрэцца з шэрагам спецыялістаў, якія высвятляць асаблівасці асобы, запішуць гаворку і жэсты, а таксама адскануюць твар для наступнага друку на 3D-прынтары. На аснове атрыманых звестак ствараецца праграма, якая пасля смерці ўсталёўваецца ў робата разам з тварам. Робат імітуе асобу, рухі рук, галавы, гаворку і ўсе астатнія даныя, атрыманыя ад памерлага.

За распрацоўку адказвае Эцука Іціхара і яе кампанія Digital Shaman. Іціхара кажа, што яна прыдумала канцэпцыю такога робата пасля смерці сваёй бабулі. «Я добра памятаю некалькі рэчаў з пахавання. Макіяж быў нанесены на твар маёй памерлай бабулі. Мы паклалі кветкі ў яе труну. Пасля таго як яе крэміравалі, наша сям'я развеяла яе попел. Гэта быў шакавальны рытуал». Тады Іціхара адчула, што пасля смерці чалавек, які пайшоў, вельмі хутка становіцца «далёкім». Так яна і прыйшла да думкі аб стварэнні такога робата.

Пасля таго як нехта памірае, сям'я можа правесці 49 дзён з машынай, пакуль яны не змогуць прыняць смерць свайго любімага чалавека. «Я думаю, гэта як пакінуць завяшчанне. Карыстальнікі могуць запісваць любое паведамленне, якое яны хочуць. Мне здаецца, што гэта сур'ёзна дапаможа тым, хто не можа рухацца далей пасля трагічнай падзеі».

## А вы ведалі, што?..

**Некаторыя жанчыны (і ТОЛЬКІ жанчыны) нараджаюцца з чатырма рознымі тыпамі колбачкападобных глядзельных клетак у вачах і здольныя адрозніваць каля ста мільёнаў розных колераў. У мужчын такога супермроку не сустракаецца НІКОЛІ. Вочы звычайных людзей маюць тры тыпы колбачкападобных глядзельных клетак і могуць успрымаць толькі адзін мільён колераў.**

У свеце налічваецца больш за 50 тысяч ядомых раслін. Аднак 60 % спажываных намі калорый раслінная паходжання даюць усяго тры культуры — рыс, кукуруза і пшаніца.

**У Ісландыі асуджаных прыходзіцца ўносіць у ліст чакання, каб яны змаглі адседзець належны тэрмін, таму што камер у турмах на ўсіх не хапае. Многім тым, хто трапіў у гэты спіс, турэмнае зняволенне ў рэшце рэшт замяняюць штрафамі або грамадскімі работамі.**

Прафесар універсітэта Канзаса Марк Хаўб сеў на дыету, якая складалася выключна са снэкаў (шакаладак, чыпсаў, печыва, вафляў, глазураваных шматкоў і таму падобных шкоднасцяў). Яго мэтай было даказаць, што для пахудзення значна важней лічыць калорыі, чым сачыць за харчовай каштоўнасцю прадуктаў. Ён страціў 12 кілаграмаў усяго за два месяцы.

**Дзіўная жудасная музыка з фільмаў жахаў выконваецца, па большай частцы, на адным унікальным інструменце, які носіць назву ватэрфон (перакладаецца як «голас вады»).**

Для таго каб палегчыць напружанне зроку, спецыялісты раяць прытрымлівацца правіла 20—20—20. Праз кожныя 20 хвілін працы за камп'ютарам трэба рабіць мінімум 20-секундны перапынак. Падчас гэтага перапынку трэба паглядзець на які-небудзь аб'ект, які знаходзіцца на адлегласці ў 20 футаў (каля 6 метраў).

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

# ЦЯРЭШКА ЗНОЎ ЖЭНІЦЦА!

КАЛЯДНЫМІ вечарамі на Лепельшчыне «жэняць Цярэшку» — «Жаніцьбай Цярэшкі» называюцца вясёлыя пасядзелкі з музыкай і танцамі. І моладзь, і старэйшыя збіраюцца ў адной хаце альбо вясковым клубе, выбіраюць «матулю» і «бацьку», утвараюць пары і наладжваюць ігрышча з песнямі і жартамі. Гэтым разам мне пашчасціла быць сведкам «жаніцьбы» ў вёсцы Стаі. У хаце трактарыста мясцовага лясгаса Яўгена Дзівіна лепельскі калектыў побытавага танца «Кругаверць» і аб'яднанне жанчын «Стайскія прысмакі» наладзілі сапраўднае вяселле: гучалі народныя найгрышы, пад якія лёгка вытанцоўваліся полькі, падэспань, кракавяк, гуляліся «Ручаёк», «Вішанька», «Пацалунак». Было што паздымаць і як уволю пасмяяцца, паласавацца стравамі, якія паставілі на «вясельны» стол. Будзе што паглядзець аматарам канала «Беларусь 3»: на свяце працавала здымачная група, на наступным тыдні «Цярэшку» пакажуць на экране.

«Жаніць Цярэшку» і далей, да самага Вадохрышча, будуць у аграсядзібах, клубах і вясковых хатах: абрад вяртаецца ў побыт лепельскага краю!

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Больш здымкаў з гэтага дасціпнага і жыццярадаснага ігрышча глядзіце на сайце zviazda.by.*

Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества), в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М., извещает о проведении 24 января 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной стоимости на 10 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** **1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** Земельный участок под объект продажи будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается) | | | |
| **Местонахождение лотов № № 1–4:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321083603601000016** общей площадью **7,3619 га (право постоянного пользования, доля в праве 299/500). Местонахождение:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4. **Целевое назначение земельного участка:** для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции | | | |
| **1** | **Капитальное строение с инв. № 310/С-3118**, общей площадью **5 343,6 кв. м,** назначение – здание главного корпуса базы, наименование – **здание главного корпуса базы. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка. **Капитальное строение с инв. № 310/С-53543**, общей площадью **156,5 кв. м,** назначение – здание специализированное энергетики, наименование – **котельная. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая,4/17. **Подробный и полный перечень имущества по лоту № 1 опубликован в газете «Звязда» от 14.11.2018 г. № 219 (28835)** | **1 305 147,60** | 65 257,38 | 130 514,76 |
| **Местонахождение лотов №№ 2–11:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка | | | | |
| **2** | **Изолированное помещение с инв. № 310/D-1736**, общей площадью **1 298,6 кв. м,** назначение – помещение административно-бытового корпуса, наименование – **помещение административно-бытового корпуса. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, пом.1. Бордюр (инв. № 00000082); покрытие из железобетонных плит (инв. № 00400068). Отопительный котел «Мир 95»(инв. № 11–1) | **299 289,60** | 14 964,48 | 29 928,96 |
| **3** | **Капитальное строение с инв. № 310/С-4428**, общей площадью **29,9 кв. м,** назначение – здание нежилое (проходная), наименование – **одноэтажное кирпичное основное строение. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка. Асфальтовое покрытие (инв. № 0002003); ворота металлические (инв. № 0002005); шлагбаум Е-713, 6м инв. № 0004033 | **32 972,40** | 1 648,62 | 3 297,24 |
| **4** | **Капитальное строение с инв. № 310/С-2990**, общей площадью **5 928,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **материальные склады. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка. Асфальтовое покрытие (инв. № 00000097) участок 2; ограждение из железобетона (инв. № 0002004) | **825 022,80** | 41 251,14 | 82,502,28 |
| **5** | **Бульдозер-погрузчик БЛ-750Щ** (зав. № 168), 2010 года выпуска, рег. знак **ЕВ-3 3889**, (инв. № 02000044). **Полуприцеп ПСТ-9 (**зав. № 171), 2010 года выпуска, рег. знак ЕВ-3 3890 (инв. № 02000040) | **24 300,00** | 1 215,00 | 2 430,00 |
| **6** | **Автобус MAZ 256270**, кузов (рама) № Y3M25627090001336, 2009 года выпуска, рег. № АВ 9158-3, инв. № 50024 | **12 204,00** | 610,20 | 1 220,40 |
| **7** | **Грузовой седельный тягач MAZ 54322**, кузов (рама) № Б/Н, год выпуска не определен, рег. № АЕ 9263-3 (инв. № 0005007). **Полуприцеп бортовой MAZ 9758002010**, кузов (рама) № Y3M97580090011574, 2009 года выпуска, рег. № А 3213А-3, инв. № 50023 | **8 640,00** | 432,00 | 864,00 |
| **8** | **Грузовой специальный сортоментовоз MAZ 631708244P2**, кузов (рама) № Y3M631708900000542, 2009 года выпуска, рег. № АВ 9202-3. **Прицеп специальный сортоментовоз MAZ 837810020**, кузов (рама) № Y3M83781090012216, 2009 года выпуска, рег. № А 3219 А-3, инв. № 0040062. **Манипулятор гидравлический М-75-04**, инв. № 00400063 | **58 968,00** | 2 948,40 | 5 896,80 |
| **9** | **Грузовой седельный тягач MAZ 6422A5320**, кузов (рама) № Y3M6422A590000949,2009 года выпуска, рег. № АВ 9155-3, инв. № 50022. **Полуприцеп бортовой MAZ 9758002010**, кузов (рама) № Y3M97580090011691, 2009 года выпуска, рег. № А 3231 А-3, инв. № 00400059 | **21 276,00** | 1 063,80 | 2 127,60 |
